ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 92 (2452)
21 лістапада 1969 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Савет Міністраў Беларускай ССР **пастанавіў:**

1. Правесці ў 1969 годзе ў рэспубліцы навагодні выпуск грашова-рэчавай латарэі на суму 750 тысяч рублёў.

Устанавіць агульную суму выйгрышаў 70 працэнтаў ад сумы выпушчаных білетаў.

2. Зацвердзіць прыкладаемыя ўмовы навагодняга выпуску грашова-рэчавай латарэі 1969 года.

(Умовы чытайце на 4-й стар.).

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНСКІХ ІДЭЙ

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Набліжаецца вялікая дата ў жыцці савецкага народа і ўсяго чалавецтва — 100-годдзе з дня нараджэння вялікага правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі, заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна. Разам з усімі братнімі савецкімі народамі сустракае гэты слаўны юбілей беларускі народ. Стагоддзю з дня нараджэння правадыра ён прысвячае свае поспехі на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва.

З пачуццём гарачага натхнення і высокай адказнасці сабраліся 19 лістапада на свой чарговы пленум беларускія пісьменнікі. На парадку дня пленума было адно пытанне — «Беларуская літаратура да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Пленум адкрыў уступным словам першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі Максім Танк. Ён гаворыць:

— Сённяшні чарговы наш пленум сабраўся напярэдадні вялікага свята — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, з чым імем звязаны ўсе велізарнейшыя пераўтварэнні ў гісторыі чалавецтва, чыё вучэнне стала гранітнай асновай новага сацыялістычнага грамадства, чые ідэі натхняюць мільёны людзей ва ўсім свеце на барацьбу за сацыяльную і нацыянальную справядлівасць, азараюць нам шляхі да камунізма, які ўжо ў нашы дні не зданню блукае па Еўропе, а з'яўляецца ўсё больш прамянеючым сонцам рэчаіснасці. І як бы нашы непрыяцелі ні стараліся перашкодзіць, подых ленінскіх ідэй — ідэй пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі — сёння адчуваецца на ўсіх кантынентах, ва ўсіх кутках зямлі.

На сучасным этапе абвастрэння барацьбы паміж капіталізмам і сацыялізмам, паміж сіламі рэакцыі і прагрэсу значна абвастрылася і ідэалагічная барацьба, асабліва на фронце мастацтва і літаратуры, роля якіх у перабудове свядомасці людзей, фарміравання светапогляду і псіхікі маладога пакалення нельга пераацаніць. Ды гэтая барацьба, як вядома, ніколі не заціхала. Яна толькі кожны раз прымала іншыя формы. Збанкрутаваная, скампраметаваная «ідэалогія» імперыялізму сёння можа завербаваць нямногіх добраахвотнікаў пад свае сцягі. Вельмі ж нясе ад яе воўчым духам, чалавеканенавісніцтвам, расізмам, пахам пораху і крыві. Вось чаму апошнімі часамі нашы ворагі так ахвотна бяруць на сваё ўзбраенне рэвізіянізм з яго псеўдамарксісцкай тэрміналогіяй, спадзеючыся, што пры дапамозе яго ім удасца «размякчыць сацыялізм», дабіцца яго «эрозіі» ці проста «навесці масты» для сваёй ідэалагічнай дыверсіі. І гэтага нам нельга не ўлічваць.

Кожны з нас ведае, якое велізарнае значэнне прыдавала і прыдае наша родная партыя ідэалагічнаму выхаванню творчай інтэлігенцыі. Работнікам мастацтва і літаратуры неабходна не толькі няспынна ўдасканальваць сваё майстэрства, але і паглыбляць светапогляд, пашыраць палітычны і эстэтычны свой кругазор, каб мастацтва і літаратура, як і навука, маглі адлюстроўваць і аналізаваць жыццё, даследаваць і ўмець сінтэзаваць.

Як вядома, тэарэтычныя і філасофскія работы Леніна памаглі многім нашым віднейшым пісьменнікам, творчы шлях якіх пачынаўся яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд, усебакова асэнсаваць падзеі бурных дзён рэвалюцыі і, стаўшы пад яе палымнеючыя сцягі, разам з народам, пад кіраўніцтвам партыі змагацца за свабоду, сацыялізм, за светлую будучыню.

Гэта пад жыватворным уплывам ленінскіх ідэй, пад уплывам пераможнай рэвалюцыі песні Купалы і Коласа, Бядулі аб цяжкім мінулым напоўніліся сонцам і радасцю перамогі, сталі песнямі будаўніцтва свабоднага і шчаслівага жыцця, песнямі, у якіх па-новаму загучала тэма патрыятызму, непарыўна звязаная з пачуццём інтэрнацыяналізму.

Гэта пад кіраўніцтвам ленінскай партыі пачаўся нябачны бурны старт маладой беларускай савецкай літаратуры, якая хутка вырасла і ўзмужнела, стала адным з перадавых атрадаў нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Далей М. Танк прыгадвае той велізарны ўплыў, які аказалі ленінскія ідэі на літаратуру былой Заходняй Беларусі, гаворыць аб тым, як вывучэнне твораў Леніна дапамагала рэвалюцыйным заходнебеларускім пісьменнікам лепш і глыбей зразумець развіццё падзей, быць у непарыўнай сувязі з жыццём народа, з яго самаахвярнай барацьбой за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

— І сёння, — падкрэслівае прамоўца, — ленінскі прынцып партыйнасці літаратуры дае нам магчымасць упэўнена ісці па вернаму шляху развіцця, не збіваючыся на бездарожжа, не захапляючыся рознымі моднымі, адарванымі ад жыцця плынямі, народжанымі ва ўдушлівай і хваравітай атмасферы Захаду.

М. Танк засяроджвае ўвагу ўдзельнікаў пленума на тых пытаннях, якія яшчэ патрабуюць свайго вырашэння. У прыватнасці, ён гаворыць аб тым, што беларускім пісьменнікам неабходна лепш, глыбей вывучаць, даследаваць жыццё, звярнуць пільную ўвагу на распрацоўку сучаснай тэмы, больш увагі аддаваць справе перакладу твораў нашай літаратуры на іншыя мовы, як і перакладаў на беларускую мову з іншых літаратур, клапаціцца аб выхаванні новай літаратурнай змены, мацаваць кантакты і сувязі з чытачамі і творчымі літаб'яднаннямі.

— Нам неабходна, — гаворыць М. Танк у заключэнне, — яшчэ больш актывізаваць свае намаганні, мабілізаваць усе свае творчыя сілы не вакол нейкіх другарадных ці ўяўных пытанняў і праблем, а вакол пытанняў і праблем, якімі жыве народ, і яшчэ больш актыўна памагаць росту нашай маладой змены, росту ўсяго таленавітага, высокаідэйнага, што ў галіне духу і культуры ўзбагачае чалавека...

З дакладам «На шырокай плыні жыцця і часу (беларуская літаратура да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна)» выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Мележ (даклад з некаторымі скарачэннямі друкуецца ў сённяшнім нумары газеты).

У абмеркаванні дакпада прынялі ўдзел Максім Лужанін, Уладзімір Юрэвіч, Сяргей Грахоўскі, Хведар Жычка, Аляксей Слесарэнка, Пятро Васілеўскі, Аляксей Карпюк, Піліп Пестрак, Міхась Скрыпка, Язэп Семяжон, Аляксандр Дзеружынскі.

З прамовай на пленуме выступіў загадчык аддзела культуры ЦК КПБ С. Марцэлеў.

У рабоце пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР прынялі ўдзел міністр культуры БССР М. Мінковіч, сакратар Ленінскага райкома КПБ г. Мінска Р. Піёнава, сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі Г. Анціпаў, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. Канавалаў, загадчык сектара літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ А. Савіцкі, старшыня праўлення Саюза кампазітараў рэспублікі Р. Шырма, старшыня праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР У. Корш-Саблін, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. Грамыка, кансультант Саюза пісьменнікаў СССР па беларускай літаратуры В. Шчадрына.

Справаздача з пленума будзе апублікавана ў наступным нумары газеты «Літаратура і мастацтва».

У ПЕРАПЫНКАХ ПАМІЖ ПАСЯДЖЭННЯМІ

М. Лынькоў і П. Панчанка.

І. Гурскі і М. Паслядовіч.

К. Губарэвіч і В. Вітка.

Н. Пашкевіч і А. Макаёнак.

С. Грахоўскі і П. Ткачоў.

Фота Ул. КРУКА.

НА ШЫРОКАЙ ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ І ЧАСУ

ДАКЛАД І. МЕЛЕЖА НА ПЛЕНУМЕ ПРАЎЛЕННЯ СП БССР

У ЖЫЦЦІ кожнага чалавека, відаць, бывае такі дзень, калі яму хочацца азірнуцца, прайсціся думкай па пройдзеным, падсумаваць вынікі. Бываюць такія дні і ў жыцці народа, жыцці краіны. Гэта — дні адметных рубяжоў, важнейшых вех.

У гэтыя дні мы стаім перад адной з найважнейшых вех — стагоддзем з дня нараджэння У. І. Леніна. У. І. Ленін — заснавальнік нашай партыі, партыі камуністаў і нашай дзяржавы — Савецкай краіны.

Савецкай краіне, Леніну абавязана жыццём многае з таго, што з'яўляецца нашым сённяшнім днём. У тым ліку наша беларуская савецкая літаратура.

Мы хочам у гэтыя перад'юбілейныя, ленінскія дні азірнуцца, падвесці вынікі дасягнутаму, узважыць усё, што мы зрабілі, падумаць пра будучыню.

КАРЭННІ нашай савецкай літаратуры — у той літаратуры, якая была да Кастрычніка 1917 года. Карэнняў гэтых колькасна ў нашай літаратуры было тады параўнаўча небагата. Але трэба адзначыць, што галоўныя сярод іх — і гэта асабліва важна — былі карэнні высокай якасці, высокай жыццядзейнасці.

Вось яны, гэтыя тады яшчэ далёка не ўсім відныя карэнні — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Цётка, Цішка Гартны, Змітрок Бядуля.

Няма патрэбы яшчэ раз цытаваць вядомыя словы з пісьма А. М. Горкага пра Янку Купалу і Якуба Коласа — яны добра вядомы, але я ўсё ж хачу звярнуць вашу ўвагу на два словы ў гэтым пісьме, якімі Горкі вызначае творчасць двух найпершых нашых паэтаў — «поистине народно».

Глыбокая, сыноўняя блізкасць да народа, чулае разуменне яго бядот, яго патрэб і яго жаданняў, сапраўдная народнасць — Горкі гэта добра ўлавіў — былі самай важнай і, я сказаў бы, самай каштоўнай адзнакай творчага грамадзянскага вобліку Янкі Купалы і Якуба Коласа. І не толькі іх. Шчырая, адданая любоў да народа паставіла побач з імі Цётку, Максіма Багдановіча, Змітрэка Бядулю, Цішку Гартнага.

Трэба адзначыць адну істотную акалічнасць паэзіі гэтых нашых папярэднікаў: блізкая да працоўных людзей, яна ўся прасякнута нязгодай з беднасцю, з сацыяльным і нацыянальным уціскам, з тагачаснымі парадкамі ў Расіі. У сваіх найвышэйшых праявах гэта была — вельмі важна адзначыць — літаратура бунтарская, рэвалюцыйная па духу.

Вялікай заслугай маладога Янкі Купалы трэба лічыць тое, што яшчэ тады, на самым пачатку свайго пісьменніцкага жыцця, ён адчуў інтэрнацыянальны характар той барацьбы, якую ўздымалі народы расійскай імперыі супраць царызму. Можам ганарыцца з поўным правам тым страсным заклікам, той адвагаю, той яснасцю мэты, з якой Янка Купала ў вершы «Там» заклікае сваіх братоў на Беларусі ісці памагаць барацьбітам, што пайшлі на смяротны бой, каб «зрабіць няволніка свабодным, даць беззямельнаму зямлі».

У самыя чорныя часы рэакцыі, што наступіла пасля 1905 года, не знікае ў лепшых творах беларускай паэзіі агеньчык рэвалюцыйнага імкнення. Красамоўна, што і ў Купалы, і ў Коласа ў гэтыя цяжкія гады не згасае надзея, што «ціша», якая наступіла, ёсць ціша перад бурай, што «вясна» прыйдзе!

Трэба аддаць належнае нашаму цудоўнаму паэту Максіму Багдановічу, паэту надзвычайнай чалавечай і грамадзянскай чуласці. Варты здзіўлення і пашаны той факт, што яшчэ ў 1915 годзе цяжка хворы наш паэт з цудоўным аптымізмам і прадбачлівасцю прадказаў блізкасць новых, даўно чаканых дзён у жыцці беларускага народа. Як прадчуванне 1917 года, яго вялікіх падзей гучаць радкі яго верша:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгараецца,
Сколькі ў хмарках залётных агня...

Мова паэзіі і мова палітыкі прыкметна розняцца. Але давайце на час выпусцім з-пад увагі форму і прыгледзімся больш уважліва да зместу. І тады нашым вачам можа адкрыцца вельмі цікавае. Нямала з таго, што пісалі ў сваіх лепшых творах нашы лепшыя паэты, было па зместу вельмі блізкае таму, што пісаў і казаў у гэтыя гады У. І. Ленін. Проста нельга не падзівіцца таму, як многія вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі сугучны таму, што пісаў Ленін аб росце рэвалюцыйных настрояў у асяроддзі сялянства, аб узмацненні інтэрнацыянальнай свядомасці ў масах розных народаў, аб няўхільным выспяванні ў Расіі рэвалюцыйнай сітуацыі напярэдадні Кастрычніка.

Шляхі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні набліжалі нашу літаратуру да ленінізма.

БЕЛАРУСКАЯ літаратура двойчы павінна быць удзячна баявому петраградскаму семаццатаму году, бітвам грамадзянскай вайны. Яна павінна быць удзячна не толькі таму, што там вырашалася права на жыццё Савецкай улады і адпаведна — савецкай літаратуры. Яна павінна быць удзячна таксама за той — для літаратуры немалаважны — факт, што ў гэтых бітвах праходзілі належнае грамадзянскае выхаванне салдаты і матросы — будучыя беларускія пісьменнікі, пачынальнікі новай, беларускай савецкай літаратуры. Мы маем законнае права ганарыцца тым, што наш сабрат па пяру Алесь Гурло, член Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі і матрос мінаносца «Забяяка», з атрадам ваенных маракоў штурмаваў Зімні палац. Мы з пашанай помнім, што ў рашаючых баях у Петраградзе ёсць свая доля і нашых цяперашніх таварышаў — былога рабочага Абухаўскага завода Ілы Гурскага і былога камендора з «Аўроры» Сілана Гусева.

Рэвалюцыі патрэбны былі не толькі салдаты і матросы, але і дзяржаўныя дзеячы. Нельга не адзначыць з гонарам, што ў той адказны момант з асяроддзя такой яшчэ маладой нашай літаратуры выйшаў дзеяч, якому суджана было адыграць надзвычайную ролю ў стварэнні не толькі нашай літаратуры, але і ў арганізацыі дзяржаўнай дзейнасці ў Беларусі, у першых кроках беларускай савецкай рэспублікі. Такі быў той час, час вялікай рэвалюцыі: трыццацігадовы былы гарбар родам з Капыля, рабочы завода «Вулкан» у Петраградзе Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны) узначаліў першы беларускі Савецкі ўрад. Цішку Гартнаму выпала быць сярод тых, хто непасрэдна ажыццяўляў указанне У. І. Леніна аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі.

Несправядліва было б ніяк не адзначыць больш сціплую, але разам з тым таксама неабходную дзейнасць байцоў-чырвонаармейцаў Міхася Кудзелькі (будучага Міхася Чарота), Кандрата Атраховіча (нашага дарагога Кандрата Крапівы), Міхася Лынькова, падпольшчыка-партызана Рыгора Мурашкі і іншых.

У баях, у змаганні за Савецкую ўладу, за справу Леніна мужнела, гартавалася першае пакаленне тых, каму выпала пачынаць савецкую беларускую літаратуру.

Першым вельмі ўзрушана заявіў пра сябе як пра паэта новай літаратуры Міхась Чарот. Паэт адразу, без якіх-небудзь ваганняў, з радасцю прыняў новую рэчаіснасць, народжаную рэвалюцыяй.

БЕЛАРУСКУЮ савецкую літаратуру ў першыя месяцы пасля заканчэння, грамадзянскай вайны можна, відаць, параўнаць з зусім яшчэ пустым полем. На гэта поле М. Чарот прыйшоў першым з маладых хлопцаў, але ўжо ў 1921 годзе далучыліся да яго чырвонаармеец Міхась Касянкоў — будучы славуты празаік Міхась Зарэцкі, звонкагалосы пятнаццацігадовы сын мінскага шаўца Андрэй Александровіч, палескі хлопец Алесь Дайлідовіч — Алесь Дудар. Добразычлівая і таксама яшчэ маладая газета «Савецкая Беларусь» стала той незабыўнай сяброўкай, якая выправіла іх у вялікую дарогу. Многіх яшчэ выправіць неўзабаве гэта добрая сяброўка, якая так багата зрабіла для беларускай культуры!

У наступным, 1922 годзе на наша літаратурнае поле, якое толькі дзе-нідзе пачало рунець, прыйдуць адразу ладнай купай яшчэ некалькі, таксама працавітыя, здатныя: Анатоль Вольны, творчая энергія якога кідаецца і ў паэзію і ў фельетоны, і ў «сур'ёзную» прозу; тады яшчэ вельмі малады, але дапытлівы, настойлівы Уладзімір Дубоўка, цікмяны выкладчык літаратуры Язэп Пушча; былы франтавік, сціплы, не вельмі гаваркі сялянскі хлопец з Нізка на Уздзеншчыне, які неўзабаве набудзе сваімі мудрымі байкамі ў народзе проста легендарную славу — Кандрат Крапіва.

Год ад году поўнілася наша поле працаўнікамі, усё шырэй рунела, усё радасней красавала. Надзвычай узбагаціў нашу сям'ю 1923 год. У гэты год у той жа паважанай «Савецкай Беларусі» і ў ленінградскім часопісе сатыры і гумару «Бегемот» з'явіліся фельетоны — нейкага, можна было падумаць, прышэльца з Афрыкі — Янкі Маўра. На старонках «Савецкай Беларусі» аб'явіў аб сабе першым празаічным творам «На граніцы» будучы выдатны майстар эпічнага і псіхалагічнага беларускага рамана — Кузьма Чорны. Гэты ж год даў нам паэта дзівоснага лірычнага таленту, які па дзіўным супадзенні нарадзіўся ў тым жа самым Нізку, дзе і лепшы наш сатырык. — Паўлюка Труса, 1923 год быў асабліва ўдалы для нашай дзіцячай літаратуры — у гэты год прыйшоў да нас Алесь Якімовіч. Разам з ім пачаў сваю творчасць і Яўген Рамановіч, які потым багата зрабіў для драматургіі і тэатра.

1924 год даў нам празаіка Рыгора Мурашку і трох паэтаў — Тодара Кляшторнага, Ю. Лявонага і яшчэ Янку Відука, які цяпер з высокай годнасцю працуе ў прозе пад слаўным імем Янкі Скрыгана.

Шчодрым быў для нас 1925 год. Ён прывёў у беларускую літаратуру цэлую кагорту таленавітых пісьменнікаў: амаль разам прыйшлі ў літаратуру Платон Галачаў, Пятро Глебка, Юрка Гаўрук, Сяргей Дарожны, Алесь Звонак, Максім Лужанін, Міхась Лынькоў, Валерый Маракоў, Алесь Пальчэўскі, Макар Паслядовіч, Васіль Сташэўскі, Хвядос Шынклер.

У жніўні і верасні наступнага года аб'явіліся два паэты, якім суджана было сказаць асабліва важнае слова ў нашай літаратуры, асабліва багата для яе зрабіць. Амаль адразу з першым вершам Петруся Броўкі, апублікаваным на поўначы нашай рэспублікі ў «Чырвонай Полаччыне», адгукнуўся на ўсходзе нашай зямлі, у Клімавіцкай акруговай газеце нейкі Аркадзь Дуда — Аркадзь Куляшоў, хлопчык 12 гадоў. Аддаючы належнае гэтым двум нашым таварышам, мы павінны быць удзячны 1926 году за тое, што ён узбагаціў нашу літаратуру такімі вельмі яркімі, багатымі сэрцам і талентам працаўнікамі, як Змітрок Астапенка, Кастусь Губарэвіч, Васіль Каваль, Юлій Таўбін, Уладзімір Хадыка, Мікола Хведаровіч, Тарас Хадкевіч (які выступаў тады як паэт).

Каб дапоўніць карціну, трэба дадаць да гэтых такія важныя факты з літаратурнай нашай гісторыі, як той, што па другі бок мяжы, у зусім іншых умовах, умовах жорсткага ўціску разгортвалася і мужнела рэвалюцыйная паэзія Заходняй Беларусі. У 1925 годзе пачаў выступаць у літаратуры Міхась Васілёк, у 1927 годзе загучаў голас Міхася Машары. 1927 годам, з дадаткам назваў панскіх турмаў, адзначаны паэтычныя творы Піліпа Пестрака, паэта і рэвалюцыянера-падпольшчыка. Пазней да іх далучацца галасы Валянціна Таўлая і Максіма Танка.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ВІЗІТНАЯ КАРТКА НОВАЙ ГЕРМАНІІ

У МІНСКУ АДКРЫЛАСЯ ВЫСТАЎКА КНІГІ ГДР

Ля стандаў выстаўкі.

Фота Ул. КРУКА.

Трэці дзень над Мінскім Палацам спорту лунаюць дзяржаўныя сцягі Савецкага Саюза, Беларускай ССР і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Тут адкрылася выстаўка нямецкай кнігі, прысвечаная 20-годдзю ГДР.

На ўрачыстасць прыбылі старшыня Камітэта па друку пры Савеце Міністраў СССР М. Міхайлаў, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ А. Тоўсцік, загадчык сектара друку ЦК КПБ Г. Конанаў, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. Канавалаў, намеснік міністра культуры БССР А. Ваніцкі, прадстаўнікі грамадскасці, літаратары, журналісты, работнікі паліграфіі і выдавецтваў, супрацоўнікі Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку. Цёпла віталі прысутныя дэлегацыю работнікаў паліграфіі і выдавецтваў ГДР на чале з намеснікам міністра культуры ГДР Бруна Хайдам.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. Канавалаў вітае нямецкіх гасцей і выказвае ўпэўненасць, што выстаўка паслужыць далейшаму пашырэнню кантактаў паміж работнікамі паліграфіі і выдавецтваў ГДР і БССР, будзе спрыяць умацаванню нашай братэрскай дружбы.

Кіраўнік нямецкай дэлегацыі Бруна Хайд расказаў аб становішчы выдавецкай справы ў ГДР, аб тым, як свабодны нямецкі народ рыхтуецца адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Са словам прывітання звярнуўся да прысутных старшыня Камітэта па друку пры Савеце Міністраў СССР М. Міхайлаў.

І вось паток людзей накіроўваецца на другі паверх Палаца, дзе разгорнута экспазіцыя выстаўкі. Тут прадстаўлена больш трох тысяч кніг-экспанатаў 76 выдавецтваў ГДР. Наведвальнікі знаёмяцца з выданнямі палітычнай, мастацкай, музычнай, дзіцячай літаратуры, шматлікімі падручнікамі, слоўнікамі, даведнікамі.

На асобных стэндах выстаўкі — творы класікаў марксізма-ленінізма, працы Уладзіміра Ільіча Леніна і кнігі аб ім. Значнае месца ў экспазіцыі займае раздзел «Гістарычныя навукі. Актуальная палітычная літаратура». Тут працы Аўгуста Бебеля, Вільгельма Піка, Вальтэра Ульбрыхта.

Наведвальнікам выстаўкі прыемна ўбачыць у ліку савецкіх кніг, выдадзеных у ГДР, творы Янкі Купалы і Якуба Коласа, Янкі Брыля і Васіля Быкава.

На выстаўцы шырока прадстаўлены і творы нямецкіх пісьменнікаў на беларускай мове.

СЛОВА ДА НАВЕДВАЛЬНІКАЎ ВЫСТАЎКІ

Бруна ХАЙД,
намеснік міністра культуры ГДР

НЯДАЎНА мы адсвяткавалі 20-годдзе Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Гэтую знамянальную дату адзначыла ўся прагрэсіўная грамадскасць свету.

Першая ў гісторыі Германіі дзяржава рабочых і сялян за два дзесяцігоддзі дасягнула выдатных поспехаў у развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, культуры і мастацтва. І сёння аб гэтых поспехах мы з гонарам можам гаварыць усяму свету, паказваць вынікі сваёй стваральнай працы, расказваць аб сваіх дасягненнях.

Выстаўка кнігі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якая прайшла ў Маскве з нагоды дваццацігоддзя нашай дзяржавы, а зараз адкрылася і ў Мінску, разглядаецца намі як своеасаблівая справаздача аб велізарным росквіце духоўнага жыцця грамадзян свабоднай краіны, аб той культурнай рэвалюцыі, якая адбылася ў нас у горадзе і вёсцы, аб настойлівым сацыялістычным выхаванні і перавыхаванні людзей.

Развіццё кнігавыдавецкай і кнігагандлёвай справы пачыналася ў нас з малога. І толькі дзякуючы клопатам Цэнтральнага Камітэта Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі і яе першага сакратара, Старшыні Дзяржаўнага Савета ГДР Вальтэра Ульбрыхта, дзякуючы бескарыслівай дапамозе савецкіх сяброў, выкарыстанню іх багатага вопыту, мы дасягнулі тых вынікаў, якія сёння маем.

Нам трэба было перавыхоўваць народ, ачышчаць яго свядомасць ад нацысцкага і мілітарысцка-нацыяналістычнага смецця, трэба было вучыць дзяцей і моладзь. Пачыналі мы са стварэння і друкавання падручнікаў і дапаможнікаў, зусім новых па змесце, на марксісцка-ленінскай аснове. Зараз мы можам з гонарам сказаць, што наша маладое пакаленне мае такія падручнікі ў дастатковай колькасці. На сённяшні дзень іх выпушчана каля 400 мільёнаў экземпляраў.

Вельмі вялікую ўвагу мы ўдзялілі прапагандзе марксізма-ленінізма. За гады народаўладдзя ў нас трыццаць разоў выдаваўся Маніфест Камуністычнай партыі, амаль паўтарамільённым тыражом выйшлі творы Маркса і Энгельса, больш чым 12-мільённым тыражом — творы У. І. Леніна. Выпушчана васьмітомная гісторыя нямецкага рабочага руху. Паралельна з гэтым мы заняліся выданнем твораў гуманістычнай і рэвалюцыйнай культурнай спадчыны нямецкага народа і іншых народаў свету і, у першую чаргу, вялікага савецкага народа. Мы змаглі выпусціць зборы твораў многіх прагрэсіўных нямецкіх пісьменнікаў, чые кнігі гітлераўцы бязлітасна знішчалі. Мы змаглі ажыццявіць такія фундаментальныя выданні, як «Бібліятэка класікі», «Бібліятэка сусветнай літаратуры», «Бібліятэка антычнага свету». Усяго пераклады зроблены з трыццаці моў свету. Гэтыя кнігі памаглі ідэйна ўмацаваць нашу дзяржаву рабочых і сялян, умацаваць адзінства нямецкага народа, зрабіць так, што марксізм-ленінізм распаўсюдзіўся ва ўсе куткі краіны, ва ўсе сферы жыцця і ўсё шырэй і шырэй авалодвае масамі.

Калі ў 1949 годзе ў ГДР было выдана каля дзвюх тысяч назваў кніг агульным тыражом у 33,4 мільёна экземпляраў, то ў 1968 годзе — 5,5 тысячы назваў тыражом 114 мільёнаў. Мы маем цяпер 790 народных кнігарань і 1.200 прыватных. Няма ў рэспубліцы ніводнага населенага пункта, ніводнага значнага прадпрыемства, дзе не было б сваёй бібліятэкі. Практычна чытае, вучыцца зараз увесь наш народ.

На гэтай выстаўцы ў Мінску мы паказваем каля трохсот кніг і выданняў. Аб якасці нашай кніжнай прадукцыі мінчане могуць меркаваць, пабачыўшы яе на ўласныя вочы, патрымаўшы ўласнымі рукамі.

Гэтая выстаўка — другая па ліку — з'яўляецца часткай шматгранных і цесных культурных сувязей паміж нашай рэспублікай і Савецкай Беларуссю. Яна працягвае серыю выставак, якія пачаліся ў 1967 годзе і былі прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Працягнуцца яны шырокім удзелам у міжнароднай выстаўцы кніг, прысвечанай стагоддзю з дня нараджэння У. І. Леніна, якую арганізоўвае Камітэт па друку пры Савеце Міністраў СССР.

Слаўны ленінскі юбілей натхняе працоўных Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі на новыя творчыя здзяйсненні, натхняе на будаўніцтва развітага сацыялістычнага грамадства. Будаўнікі плошчы імя Леніна ў Берліне выступілі ініцыятарамі ўсенароднага сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар правадыра працоўных усяго свету. Іх ініцыятыва знайшла самы шырокі водгук, у спаборніцтва ўключаюцца ўсё новыя і новыя калектывы фабрык і заводаў, кааператыўных сельскіх гаспадарак. Да гэтага руху далучыліся і супрацоўнікі выдавецтваў, друкарань і кнігагандлёвай сеткі.

У гонар ленінскага юбілею будзе выпушчана многа новых кніг. Яны з'явяцца каштоўным укладам у далейшы ўздым духоўнага жыцця, з'явяцца сведчаннем новага кроку ў развіцці нашай культуры і навукі, будуць садзейнічаць умацаванню сацыялізма ў нашай краіне, дружбы і супрацоўніцтва паміж нямецкім народам і народамі СССР і іншых краін сацыялістычнага лагера, забеспячэнню міру, бяспекі і супрацоўніцтва народаў Еўропы.

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР МУЗКАМЕДЫІ БССР

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі і Савет Міністраў БССР прынялі пастанову аб стварэнні Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР. Прадугледжваецца, што новы творчы калектыў пачне першы сезон у чацвёртым квартале 1970 года.

Існуючы цяпер Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі, які базіруецца ў Бабруйску, намечана рэарганізаваць у абласны драматычны тэатр.

БЕЛТА.

ВЕСТКА аб прыездзе артыстаў з Белай Дубровы з хуткасцю маланкі абляцела Клеявічы. Калі сцямнела, клуб быў забіты дарэшты. На баках сцэны гронкамі вісела дзятва. За чырвонай заслонай хвалявалісь артысты.

І вось на сцэну выйшла немаладая жанчына ў хусцінцы, сціпла завязанай пад бараду. Я пазнаў яе адразу, хоць і не бачыў добрых дзесяць гадоў. Гэта была настаўніца Ганна Сямёнаўна Глазоўская. Нягучна, спакойна загаварыла яна пра лепшых людзей мясцовага аддзялення саўгаса «Дуброва». Гаварыла проста, быццам гутарыла са старымі добрымі сябрамі. І словы былі будзённыя, звычайныя, але ў іх адчуваўся спрадвечны клопат земляроба аб хлебе, ураджаі. І мо таму слухалі Ганну Сямёнаўну з незвычайнай увагай.

Потым быў канцэрт. Гучалі песні, задзірлівыя частушкі. Глазоўская сцішана стаяла ўбаку, за кулісамі, кіравала канцэртам. Маленькія рукі з набраклымі жылкамі выдавалі хваляванне. Сяды-тады яна пазірала ў залу, але мяне нібы не пазнавала, хоць пасадзілі як госця ў першых радах, сярод дзядоў. Ды яна мо' і нікога не заўважала — усёй істотай жыла там, на сцэне.

Пасля канцэрта мне хацелася падысці да Ганны Сямёнаўны, пагаварыць з ёй, з артыстамі. Ды было позна, артысты спяшаліся дамоў, і я не стаў нікога турбаваць. Праз некалькі дзён выбраўшы час, пайшоў у Белую Дуброву.

Стаяў пачатак верасня, разгаралася маладое бабіна лета. На зжатым полі жаўцелі стагі саломы. Стаялі яны густа, мусіць, ураджай быў неблагі. На правадах, быццам нанізаныя, сядзелі ластаўкі. Ціха стаялі кучаравыя, падзалочаныя бяроскі. Здавалася, што прырода вучыцца маўчаць, рыхтуецца да доўгай зімовай спячкі.

Ох, як добра ведаў я гэты бальшак! Па гэтай дарозе тры гады хадзіў я ў школу і ў дождж, і ў снег, і ў цемень. І зараз, ідучы па ім, нібы вяртаўся ў дзяцінства. Дарога змянілася мала: сталі шырэйшымі каляіны — машыны разбілі, паменшала старых бяроз, затое як падраслі дрэўцы, што мы садзілі!

Міжволі ўспомніліся далёкія пасляваенныя гады. Успомніліся ўрокі рускай літаратуры ў пятым класе. Настаўніца, мілая жанчына з вялікімі шэрымі вачыма, у сіняй сукенцы ў белы гарошак, чытала быліны пра Мікулу Селянінавіча, Салаўя-разбойніка. У руках яна трымала кнігу, але заглядвала ў яе рэдка. Мяккі пявучы голас настаўніцы гучаў то звонка і ўрачыста, то грозна і сярдзіта. І гэтая невысокая жанчына здавалася нам вялікай і казачна дужай, як тыя былінныя асілкі...

Мы гатовы былі слухаць Ганну Сямёнаўну і пасля званка, калі яе ўрок быў апошнім, хаця ўсе вучні 5 «в» жылі не ў Белай Дуброве, а ў суседніх вёсках і хадзілі ў школу за некалькі кіламетраў.

Мы чулі, што Глазоўская была партызанкай, але сама яна аб гэтым не расказвала. Тады людзі стараліся радзей успамінаць пра вайну, мо таму, што зусім яшчэ свежымі былі раны, нанесеныя ёю. Толькі праз многа гадоў мне давялося дазнацца аб падпольнай дзейнасці настаўніцы.

ДА ВАЙНЫ Глазоўская працавала ў вёсцы Тупічын. Тут яна пазнаёмілася з выкладчыкам хіміі Фёдарам Кісялёвым. Абодва маладыя, прыгожыя, яны пакахалі адзін аднаго. За дзень да вяселля здарылася бяда: Фёдар праводзіў у класе вопыты з бертолетавай соллю, колба ўзарвалася і яму адарвала кісць левай рукі і два пальцы на правай. Кісялёва адвезлі ў бальніцу.

Вяселле прыйшлося адкласці.

— Калі ты пойдзеш за калеку, ад нас помачы не чакай, — гразілі бацькі, калі Фёдар выпісаўся з бальніцы.

Але вяселле згулялі. Дваццаць другога чэрвеня сорак першага года Кісялёва прынялі ў партыю. У райкоме пачуў ён страшнае слова — вайна.

Пацягнуліся змрочныя дні акупацыі. Праз некаторы час Глазоўская і Кісялёў пазнаёміліся з афіцэрам П. Кляцко, былым сакратаром Антопальскага райкома партыі Ц. Субоціным, капітанам М. Скандзілавым, якія арганізавалі партызанскі атрад «За Савецкую Беларусь». Устанавілі з ім цесную сувязь, рызыкуючы жыццём перадавалі ў лес адзенне, прадукты, соль. Па заданні партызан Кісялёў стаў пісарам. «Здраднікі!» — не раз чулі яны за спіной праклёны.

— Нічога, Федзя, трымайся. Гэта ж здорава, што нашы людзі так ненавідзяць фашыстаў і іх памагатых, — не раз гаварыла яму жонка.

Глазоўская шмат перадала ў атрад каштоўных звестак і дакументаў, якія даставаў муж. Партызаны забралі каштоўны груз.

К канцу 42-га года партызаны асабліва актывізаваліся. Недалёка ад Бялынкавіч яны пусцілі пад адхон варожы эшалон з тэхнікай, спалілі ў мястэчку спіртзавод і млын, адчоўленыя немцамі. Перапалоханыя бургамістр і паліцаі ўцяклі ў Касцюковічы. Паўнамоцтвы пісара Кісялёва фактычна скончыліся.

Вырашылі так: Ганна з малым сынам Барысам паедзе да бацькоў у Белую Дуброву, а Фёдар пойдзе ў атрад. Перад адыходам у лес ён рызыкнуў прабрацца ў Касцюковічы да сувязных. У горадзе яго арыштавалі. Расказваюць, што ён выхапіў гранату і хацеў зубамі тузануць кольца, але не паспеў — граната выслізнула з яго кульцяпак...

Некалькі дзён дапытвалі гітлераўцы Кісялёва. Фёдар ніколі на не выдаў. Фашысты расстралялі яго.

Глазоўская жыла ў Белай Дуброве, як і раней падтрымлівала сувязь з партызанамі. Перадавала іх звесткі, якія ўдавалася даведацца ад мясцовых жыхароў. Восенню сорак трэцяга года вёску вызваліла Савецкая Армія.

ВЯСНОЙ 1967 года ў Касцюковічах сабраліся ўдзельнікі партызанскіх баёў. З Бранска прыехаў былы камандзір атрада «За Савецкую Беларусь» Яромін, з Віцебшчыны — камісар Субоцін і іншыя. Моцна абдымаліся баявыя сябры. Успаміналі паходы, засады. Мінутай маўчання ўшанавалі ветэраны памяць тых, хто не дажыў да перамогі.

— Эх, Ганна Сямёнаўна, жыццё то якое стала! Каб скінуць гадкоў дваццаць...— усміхаўся Субоцін.

— Гады сваё бяруць, Ціт Фёдаравіч... Вось і я ўжо на пенсіі... Праўда, сядзець дома не магу. Патрохі цялёпкаюся...

«Патрохі...» Мне расказалі ў Белай Дуброве і настаўнікі, і мясцовыя жыхары, колькі клопату добраахвотна ўсклала на свае плечы Глазоўская.

— Харошы яна чалавек, — гаварыла мне старая Марына Сцяпанаўна Уласенка. — Прыпяшэла трохі наша Сямёнаўна, але рэпетыцыі гэтыя свае не кідае... А колькі яна людзям дабра робіць! Мне памагла пенсіі дабіцца... Камуністы ў саўгасны партком выбралі яе...

Ганна Сямёнаўна сустрэла мяне ветліва, узрадавалася. Доўга гутарылі мы пра яе работу, успаміналі вучняў майго выпуску...

Пазней Ганна Сямёнаўна пісала мне цікавыя пісьмы. «Кажуць, што ў пенсіянера шмат вольнага часу, а ў мяне яго няма. Амаль кожны тыдзень — канцэрт. Кепска з рэпертуарам. Часопісы, якія выпісваем, не задавальняюць: то матэрыял не адпавядае нашым умовам, то часам здаецца, што друкуюць абы што, не падумаўшы... Ці няма ў вас чаго цікавага?.. Сатыры б, гумару дастаць для канферансье... Часам здаецца — не выцягну... А так хочацца выцягнуць! Клуб цяпер мой другі дом, мая другая прафесія. Суседзі сваё: кідай канцэрты, паберажы сябе, адпачні. Медыкі сваё: не шкадуеш сябе. Шкадую, але хачу працаваць, не магу пакінуць... Дарэчы, нядаўна атрымала Грамату Вярхоўнага Савета БССР».

У другім пісьме яна пісала, як цікава прайшло свята песні. У трэцім — як добра выступілі ў Мінску.

БЕЛАЯ ДУБРОВА — вялікае сяло. Тут ёсць сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі і іншыя мясцовыя ўстановы. Нямала ў вёсцы інтэлігенцыі. Але і сельскі інтэлігент часам тоне ў бытавых, гаспадарчых клопатах. Думаеце, мала спраў, грамадскіх даручэнняў, розных абавязкаў у галоўнага агранома саўгаса Пятра Смяглікава, галоўнага заатэхніка Пятра Чаркасава, дырэктара школы Уладзіміра Казадоева? Вядома, нямала. І ўсё ж такі Глазоўская здолела зацягнуць іх у гурткі мастацкай самадзейнасці. І не толькі іх саміх, а і жонак.

— Пяць сямейных пар ходзяць на рэпетыцыі, — з гонарам гаварыла Глазоўская. — Ды ёсць яшчэ ў нас і рэзервы. Так што скора будзе больш...

Апошняя наша сустрэча з Глазоўскай адбылася зусім нядаўна. Мы прыехалі ў Белую Дуброву разам з М. Беленькім, загадчыкам Касцюковіцкага раённага аддзела культуры. Быў час абеду, на дзвярах клуба вісеў замок, і мы паехалі да Ганны Сямёнаўны.

— Заходзьце, госці, — ветліва сустрэла Глазоўская. Неўзабаве на стале з'явілася шырокая ваза з грушамі. Гаворка зайшла аб сёлетнім конкурсе-аглядзе самадзейных калектываў, аб рэпертуары, касцюмах, аб удзельніках...

Любяць спяваць у Белай Дуброве. Ого, як звонка тут гукаюць вясну. Гулкае рэха далёка коціцца па залітым вадою лузе, аж да самага лесу і вяртаецца назад, сцішанае, крохкае і чыстае. А як спяваюць жанчыны, калі ідуць летнім надвячоркам з поля! Другая брыгада асабліва славіцца песнямі. Кіруе ёю Тамара Мельнік, вялікі аматар спеваў. Разам са сваім брыгадзірам у хоры ўдзельнічаюць паляводы Валянціна Ананенка, Таццяна Арлова, Кацярына Кавалёва, Ніна Фраленка. Але паспяваць пад настрой ідучы з работы — адно, а хадзіць на рэпетыцыі, выступаць на канцэртах, калі ў цябе сям'я, гаспадарка — зусім іншае. І не так лёгка ўдалося Ганне Сямёнаўне ўгаварыць жанчын.

Слухаў я і міжволі думаў: што ж прымушае Глазоўскую быць такою няўрымслівай? Карыслівасць? Не. Ганна Сямёнаўна за гэта не атрымлівае ні капейкі. А мо славалюбства? Гэтага, відаць, крыху, ёсць. Вядома, у лепшым сэнсе слова. Яна засталася ў душы той баявітай камсамолкай, якой была перад вайной. «Калі не я, то хто?» Па гэтым высокім прынцыпе жыве настаўніца і зараз.

Мяняліся загадчыкі клуба. Адны дапамагалі ёй, другія толькі заміналі. Зараз клубам кіруе Міхась Мамута, даволі ініцыятыўны спецыяліст, ёсць і бібліятэкарка. Але без Ганны Сямёнаўны тут не праводзіцца ні адно мерапрыемства.

І яшчэ падумалася мне. Мы ў вялікім даўгу перад такімі энтузіястамі культуры, як Глазоўская. Яны заслугоўваюць глыбокай павагі і сардэчнай падзякі. Але не заўсёды яны знаходзяць разуменне і падтрымку.

...Пішу гэтыя радкі познім вечарам. У пакоі цішыня. За акном — вые, свішча вецер. І ўявілася мне, як у гэты час у далёкай Белай Дуброве вяртаецца з рэпетыцыі Ганна Сямёнаўна, зябка хутаецца ў хустку. Прыбяўляе кроку, упарта згінаецца насустрач ветру... «Трэба мне ўжо кідаць... Хопіць цягацца», — мусіць, думае настаўніца.

А праз дзень-другі Ганна Сямёнаўна зноў ідзе ў клуб. Бо не можа камуніст Глазоўская жыць інакш.

Пераклічка сельскіх клубаў

АДДАНАСЦЬ

Л. ЛЯВОНАЎ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»

ЯНЫ ПРЫНЯТЫ Ў ТВОРЧЫЯ САЮЗЫ

У САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ

Крытык і літаратуразнаўца Сяргей ГУСАК. Нарадзіўся ў вёсцы Іванькаўшчына Мазырскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і аспірантуру. Кандыдат філалагічных навук. Артыкулы і рэцэнзіі друкаваў у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Неман». У 1967 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў яго крытыка-бібліяграфічны нарыс «Аляксей Кулакоўскі». С. Гусак — рэктар Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Член КПСС.

У САЮЗ МАСТАКОЎ

ПАНАМАРЭНКА Леанід Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1937 годзе. У 1957 годзе скончыў Вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя Мухіной і ў 1968 годзе Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Стварыў дзесяткі арыгінальных мастацкіх эталонаў па кераміцы, дрэву, пластмасе. Большасць з іх экспанавалася на рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках і на ВДНГ.

ПАШЧАСЦЬЕЎ Уладзімір Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1944 годзе. Скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут у 1967 годзе. Удзельнічаў у выстаўцы «Мастакі Беларусі — 50-годдзю Савецкай улады», у рэспубліканскай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю пагранічных войск, ва Усесаюзнай выстаўцы «50 год ВЛКСМ» і юбілейнай рэспубліканскай выстаўцы «50 год БССР і КПБ». Асноўныя работы: серыі графічных лістоў аб шахцёрах Салігорска і пагранічніках Брэста.

ПЕТЭРСОН Эльмарт. Нарадзіўся ў 1935 годзе. У 1962 годзе скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працуе загадчыкам аддзела перасоўных выставак у Беларускім дзяржаўным мастацкім музеі. Э. Петэрсон — аўтар цэлага шэрагу мастацтвазнаўчых артыкулаў, надрукаваных у рэспубліканскіх і цэнтральных выданнях.

ПУШКАР Мікалай Мікітавіч. Нарадзіўся ў 1919 годзе. У 1937 годзе скончыў мастацкае вучылішча ў Харкаве. Удзельнічаў у рэспубліканскіх, усесаюзных, міжнародных выстаўках. На Усесаюзным конкурсе, прысвечаным 50-годдзю Савецкай улады, за скульптурныя кампазіцыі «Паляшук», «Палескія напевы», «Браты беларусы» атрымаў II і III прэміі.

САМАЧОРНАЎ Уладзімір Аркадзьевіч. Нарадзіўся ў 1933 годзе. У 1964 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Удзельнічаў у выстаўках: «На варце міру», «Мастакі — дзецям», Усесаюзнай выстаўцы дыпломных работ. У 1963 годзе ўдзельнічаў ва Усесаюзнай выстаўцы «Лепшыя кнігі года» выданнем «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі».

ХАРАШЭВІЧ Канстанцін Іванавіч. Нарадзіўся ў 1927 годзе. У 1958 годзе скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. Удзельнічаць у рэспубліканскіх выстаўках пачаў з 1961 года. Асноўныя работы: «Бярэзінскія торфараспрацоўкі», «Паўстанне нарачанскіх рыбакоў», «Каля прычалу», «Рыбацкі кацер».

ЦОМПЕЛЬ Павел Аксанавіч. Нарадзіўся ў 1933 годзе. У 1965 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Удзельнічаў у выстаўцы «Мастакі Беларусі — 50-годдзю Савецкай улады». З'яўляецца аўтарам помнікаў загінуўшым воінам і партызанам у вёсках Палікі і Інані, Кургана славы ў Бабруйску, аўтарам праектаў помнікаў на месцы канцлагера ў Масюкоўшчыне і воінам-вызваліцелям у Оршы.

ШАРАНГОВІЧ Васіль Пятровіч. Нарадзіўся ў 1939 годзе. У 1966 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Аформіў больш сарака выданняў у мінскіх і маскоўскіх выдавецтвах. Сярод іх зборнік вершаў Я. Коласа «З майго летапісу», «Мая Беларусь» Т. Хадкевіча, «Лірыка» А. Міцкевіча, «Салавей» З. Бядулі, паэма у Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін».

ШПАРТАЎ Уладзімір Нікіфаравіч. Нарадзіўся ў 1939 годзе. У 1965 годзе скончыў графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Удзельнічаў у рэспубліканскіх выстаўках маладых мастакоў 1965 і 1966 гадоў. Асноўныя работы: «Восень», «Дарога на будаўніцтва», «Дзіцячы садзік», «Разліў».

ЧЫСТЫЯ ГАЛАСЫ БАЯНАЎ

Неяк агітбрыгада Крычаўскай музычнай школы завітала пад Чэрыкаў, у далёкі саўгас «Язерскі». Народу ў клубе сабралася багата, і пакуль артысты рыхтаваліся да выступлення, язерскія хлопцы і дзяўчаты рашылі наладзіць танцы. Агітбрыгадаўцы хацелі было, як звычайна ў такіх выпадках, даць свайго гарманіста, як раптам чуюць у зале працяжны ўздых баяна. А следам палілася мелодыя. Іграў, па ўсім адчувалася, не самавучка. І як жа была ўзрадаваны агітбрыгадаўцы, калі ў баяністу пазналі Мікалая Цалабанава!

Усе ўспомнілі, як прыязджаў ён у музычную школу на заняткі. Ніштo не стрымлівала хлопца — ні завіруха, ні мароз. І ўсе дзесяць месяцаў вучобы ён ездзіў больш як за трыццаць кіламетраў да музычнай школы, якая размешчана ў пасёлку Крычаўскага цэмента-шыфернага камбіната.

Ідэя наладзіць пры школе дзесяцімесячныя курсы баяністаў нарадзілася некалькі год назад. У сельскіх клубах усё больш і больш адчуваўся недахоп гарманістаў. Рос узровень майстэрства самадзейных калектываў, іх перастаў задавальняць акампанемент вясковых гарманістаў-самавучак.

Вучыцца на курсы накіроўвалі юнакоў і дзяўчат дырэкцыі саўгасаў ці праўленні калгасаў. Была спачатку ўстаноўлена і плата за навучанне. Але ў хуткім часе калектыў выкладчыкаў музычнай школы вырашыў: «Баяністаў для сяла будзем навучаць бясплатна».

Чатыры гады працуюць пры музычнай школе курсы. За гэты час іх скончыла каля пятнаццаці чалавек. Адны з іх працуюць эвраз загадчыкамі сельскіх клубаў, другія — на розных работах у калгасах і саўгасах а ў вольны час прыходзяць на заняткі гурткоў мастацкай самадзейнасці. І чыстыя галасы баянаў уліваюцца ў ансамблі вясковых музыкантаў, суправаджаюць звонкія песні самадзейных спевакоў.

Выкладчыкі музычнай школы не кідаюць шэфскай сувязі над сваімі выхаванцамі і зараз: то памогуць рэпертуарам, то дадуць карысную параду, то разам развучаць складаны твор.

Э. ЯЛУГІН.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

БРЭСЦКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ

БОЛЬШ сямідзесяці работ семнаццаці маладых жывапісцаў, скульптараў, графікаў выстаўлена на агляд у Брэсцкім мастацкім салоне. Можна смела сказаць: гэтай выстаўкай адкрываецца новая старонка ў мастацкім летапісе вобласці. Маладыя мастакі Брэстчыны на поўны голас загаварылі з гледачом.

Міжволі прыгадваецца восень 1946 года. Тады ў мастацкай выстаўцы прынялі ўдзел усяго шэсць мастакоў, па сутнасці, самадзейных. Сярод іх П. Данелія, І. Рудчык, М. Аўчыннікаў і іншыя — цяперашнія «ветэраны» брэсцкага калектыву мастакоў.

Сённяшнія ж дэбютанты — у асноўным выпускнікі мастацкіх інстытутаў і вучылішчаў. Першыя іх крокі ў мастацтве досыць упэўненыя.

Такім чынам, прыток маладых у калектыў мастакоў Брэстчыны ўзмацніў рэальныя магчымасці для афармлення ў Брэсце абласнога аддзялення Саюза мастакоў БССР.

Я спынюся на работах тых аўтараў, якія хвалююць гледача і вызначаюць аблічча гэтай выстаўкі.

Перш за ўсё — аб скульптуры. Вылучаюцца яснасцю задумы, кампазіцыйнай завершанасцю, прафесіянальнай спеласцю творы В. Андрушчанкі, І. Хоміча, Г. Пясецкага.

Складаную задачу ўвасаблення вобраза Ільіча паставіў перад сабой В. Андрушчанка. Гэты скульптар добра ўзброены тэхнічна. Ён адчувае пластыку. Яго творчаму тэмпераменту і стылю ўласціва імкненне да абагуленых манументальных форм. І вобраз Ільіча малады скульптар трактуе манументальна, імкнучыся акцэнтаваць у галаўным партрэце правадыра ленінскую мудрасць, волю, чалавечнасць.

Эмацыянальна насычаная кампазіцыя В. Андрушчанкі «1919 год» (дрэва), якая экспанавалася ў 1967 годзе ў Маскве. Магутны рэвалюцыйны парыў народа і вялізнае напружанне гадоў грамадзянскай вайны аўтар перадае праз пластыку вобраза юнага будзёнаўца. Добрае валоданне матэрыялам, пачуццё кампазіцыі памаглі маладому скульптару па-свойму і лаканічна «прачытаць» вялікую сацыяльную тэму. Рашуча пазбаўляючыся ўяўнага пафасу, ён раскрывае звычайны, здавалася б, эпізод — баец і конь прагна п'юць ваду, каб праз хвілю зноў рынуцца ў бой. Але колькі сказана праз гэты просты сюжэт!..

З цікавасцю знаёмішся з партрэтамі Я. Свярдлова і Г. Дзімітрава, якія В. Андрушчанка вырашыў у манументальным плане.

Калі работы В. Андрушчанкі — экспрэсіўныя, дык І. Хоміча — эпічна спакойныя. Погляд ягоных герояў быццам скіраваны ў сябе. Дэталі апушчаны. Рысы абагулены. Сілуэты пазбаўлены вострых кутоў. Кампазіцыі строгія. Малады скульптар пераважна стварае галаўныя партрэты з дрэва. У іх заўсёды чытаецца думка, адчуваецца трапятанне жывога чалавечага пачуцця.

Вось яго кампазіцыйныя партрэты «Маці» і «Чаканне». У першым — глыбокі сум маці, у другім — лірыка чакання маладой жанчыны.

Удалая і кампазіцыя «Хлеб» (таніраваны гіпс), у якой добра перададзены нацыянальны характар.

Г. Пясецкі паказаў невялікую паэтычную кампазіцыю «Мелодыя» (алюміній). Жаночая фігурка ў парыве ўвысь. Лініі і формы гарманічна спалучаюцца ў непаўторна чароўную пластычную мелодыю, на дзіва адпавядаючы назве. Другая работа Г. Пясецкага — жаночая галоўка «Восень» (дрэва). Колер, тэкстура, форма — усё падпіраўкавана перадачы задумлівай пары залатой восені.

Багата прадстаўлены на выстаўцы жывапіс і графіка. Праўда, не ўсе работы аднолькава глыбокія па задуме і арыгінальныя па яе вырашэнні. На многіх работах — адбітак вучнёўства.

Сакавітасцю фарбаў, выразнасцю малюнка, свежасцю ўспрыняцця рэчаіснасці прываблiваюць работы А. Сяліцкага — «Нацюрморт» і «Індустрыяльны пейзаж» (масла), В. Усціненкі — «Нацюрморт з ананасам» (акварэль), М. Казлоўскага — «Зімовы пейзаж Палесся» і малюнак «Рамантыка», І. Данілава — графічныя лісты «Русь», «Вставай, страна агромная!», «У паход» (туш). Не пакідаюць гледача абыякавым ілюстрацыі да горкаўскіх апавяданняў «Старая Ізергіль» і «Мальва» Б. Дамненкі (чорная акварэль), лінагравюры В. Кускова «Красавік», «Мара», акварэлі Л. Доўбуша «Веснавы матыў», «Канец сакавіка», выразны па малюнку і псіхалагічнай распрацоўцы «Студэнт» М. Клімава, выкананы каляровымі алоўкамі.

Яшчэ два гады назад пакарыў сэрцы гледачоў Брэста У. Нікалаеў. Ён паказаў тады сваю дыпломную работу — серыю эскізаў да пастаноўкі оперы «Трубадур». Мы ўбачылі не толькі цікавага тэатральнага мастака, але і таленавітага жывапісца. Добрая школа, упэўнены малюнак, багатая палітра, вобразнае мысленне, развітае пачуццё кампазіцыі характарызуюць творчую індывідуальнасць гэтага мастака. Ён упэўнена валодае жывапісам, графікай, тэатральна-дэкаратыўным мастацтвам. Шматграннасць здольнасцей выявіў мастак і на гэтай выстаўцы.

Побач з серыяй каларытных пейзажаў маслам, пастэллю — цікава задуманыя і востра вырашаныя эскізы да пастаноўкі шэкспіраўскай трагедыі «Кароль Лір» (туш і акварэль). Тут жа — тонкія, прывабныя малюнкі алоўкам. Асабліва вабяць сярод малюнкаў жаночыя галоўкі. І нават чаканку паказаў У. Нікалаеў.

Многія малюнкі У. Нікалаева выкананы элегантна, з густам. Але захапляюць не ўсе. Мяне асабіста захапіла тэматычная кампазіцыя «Бярозка», выкананая гуашшу ў тонах грызайлі. Тут партрэтны матыў (жаночая галоўка) тактоўна ўпісаны ў пейзаж. І ўсё ж гэтага мала — здаецца, мастак паскупіўся сказаць больш.

У. Нікалаеву патрэбна вялікая, значная тэма. Яму яўна процівпаказаны лірыка-сузіральны спакой. Вельмі хочацца, каб увесь яго творчы патэнцыял ускалыхнуўся, сутыкнуўшыся са значнай сучаснай тэмай, каб загучаў на поўную сілу паэтычны голас мастака.

Вядома, на выстаўку трапілі і творы недапрацаваныя, павярхоўныя па задуме, недасканалыя па ўвасабленні. Старэйшыя калегі, якія дапамагалі моладзі арганізаваць выстаўку, маглі б падысці больш патрабавальна не толькі да адбору экспанатаў на выстаўку, але і памагчы добрай парадай тады, калі некаторыя творы маладых былі яшчэ ў рабоце. Часцей трэба сустракацца дзеля творчых спрэчак, даваць парады адзін аднаму, абменьвацца вопытам.

І ўсё ж — паўтару — выстаўка ўвачавідкі пераконвае, што ў аснове сваёй калектыў маладых брэсцкіх мастакоў працуе цікава, натхнёна.

Аркадзь СУРСКІ.

Брэст.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр імя Якуба Коласа паказаў віцяблянам новы спектакль — камедыю «Нічога не здарылася» М. Гіндзіна і Г. Рабкіна. Ролі выконваюць маладыя артысты, рэжысёр таксама з артыстаў — Г. Дубаў. Дэкарацыі па эскізах народнага мастака БССР Я. Ніналаева. Музыку да спектакля напісаў Б. Насоўскі. На здымку вы бачыце Вару (заслужаная артыстка БССР Т. Шашкіна) і Лёву Пашкевіча (артыст Г. Валчок) у шчырай размове...

Фота С. КОХАНА.

ТЭАТР

«ФЛОРЫЯ ТОСКА», СУСТРЭЧА ТРЭЦЯЯ

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета зноў паставіў оперу «Флорыя Тоска» — твор Пучыні, які належыць да ліку найбольш рэпертуарных: вядома, што яна часам паспяхова канкуруе з шэдэўрамі Вердзі, Візэ, Чайкоўскага.

У «Тосцы» кампазітар звярнуўся да драмы, поўнай бурных палітычных і чалавечых страсцей, якія даюць моцны тэатральны эфект. Гэта цалкам адпавядала «крэда» Пучыні, які ставіў перад тэатрам тры задачы: зацікавіць, здзівіць і ўзрушыць. Гэтаму ён і прысвяціў свае творчыя шуканні.

Але Пучыні на тэатральных падмостках, як кажуць, «аброс» традыцыямі-штампамі, яго сюжэты і мелодыі здаюцца выканаўцам «самаігральнымі». Колькі ў партытуры гэтай оперы пагроз абмежавацца сентыментальнасцю, расчуліць, а не ўзрушыць слухача!

Справа ў тым, што сентыментальнасць меладрамы Віктар'ена Сарду, пакладзенай у аснову лібрэта «Тоскі», нягледзячы на пераробкі, усё ж адчуваецца ў драматычных сітуацыях оперы. І музыка, якая гэтую чуллівасць пераадольвае, вельмі часта аказваецца на той мяжы, за якой — меладраматычныя эфекты. І тады ўсё залежыць ад густу і культуры выканаўцаў, якія здольны або не здольны стрымліваць сябе на гэтай мяжы.

Як жа пераадольвае гэтыя цяжкасці тэатр?

Поспех спектакля ў многім залежыць ад выканання галоўнай ролі. Партыю Флорыі Тоскі спяваюць К. Старыкава і Г. Лебедзева.

Шчыра кажучы, Старыкава яшчэ не авалодала сваёй партыяй: ёй нестае пакуль што свабоды і лёгкасці. Прыгожае лірыка-драматычнае сапрана салісткі гучыць рэскавата ў верхніх рэгістрах. Мне здалося, што не актрыса пануе над голасам, а голас над ёй. Але, бадай, галоўны недахоп у тым, што салістка не раскрывае ўсю глыбіню вялікага жаночага кахання. У Пучыні Тоска какетлівая, неўтаймаваная ў сваіх пачуццях, раўнівая. І яна — бясконца кахае. Старыкава ж паспабляе гэтыя рысы характару гераіні. У яе Флорыі больш мітусні, чым супярэчлівых і адзіных у сваім пафасе эмоцый.

Выкананне партыі Тоскі Г. Лебедзевай значна бліжэй да ўдачы. Галоўнае ў створаным артысткай вобразе — жанчына, якая паглыблена ў вялікае пачуццё. Сваім каханнем яна правярае рухі сваёй душы, праўду і зло жыцця. Цікава, што рэўнасць гераіні Старыкавай ідзе ад таго, што Флорыя надзвычай гаварлівая, а ў Тоскі — Лебедзевай рэўнасць дыктуецца страхам за сваё кахане, у якім яна бачыць сэнс жыцця.

У першай дзеі Лебедзева дае партрэт шчырай натуры, і асабліва пяшчотна выканана ёю першае арыёза. І гэтая пяшчотнасць потым робіцца пераважнай эмацыянальнай рысай гераіні. У паядынках з Скарпіа адцяняецца высакароднае аблічча трохі экстравагантнай асобы.

Па-розному спяваюць партыю мастака Марыю Каварадосі З. Бабій і малады спявак — выпускнік Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі М. Галкоўскі. Гэта і зразумела: у аднаго вялікі вопыт, а другі толькі пачынае шлях у мастацтве.

Калі сацыяльная вастрыня канфлікту оперы ў партыі Тоскі можа быць перададзена праз непахісную веру гераіні ва ўсёперамагальную сілу кахання, дык Каварадосі раскрывае гэта праз асабістую мужнасць. Выканаўца павінен спяваць і іграць у вобразе драматызм моцнай духам натуры. Так, раскрываць драматызм яркай мастацкай натуры, а не толькі выконваць арыі, якія больш-менш пацвярджаюць рашучыя імкненні Каварадосі.

На мой погляд, М. Галкоўскі па-акцёрску не зусім смела авалодвае партыяй Каварадосі. Скаваны ён і фізічна, і ў вакале. Часам голас артыста гучыць прыціснута, асабліва ў верхнім рэгістры. Як вядома, у партыі Каварадосі «ўзлёты» голасу — асноўны сродак вакальнай характарыстыкі юнака-вольналюба. Спеваку трэба яшчэ сур'ёзна працаваць і над дыкцыяй, многае зрабіць, каб пераадолець скаванасць. У тым, што М. Галкоўскі мае права на ролю, мы не сумняваемся, аднак партыя Каварадосі — з тых партый, над якімі варта «пацець».

Няма патрэбы рабіць камплімэнты голасу артыста З. Бабія; яны даўно ўжо і многа разоў гаварыліся спевану. Але «Тоска» паказвае, што артыст усё часцей ператварае голас з мастацкага сродку ў мэту. І партыя Каварадосі для яго — гэта толькі зручная прычына для дэманстрацыі артыстам магчымасцей вакалу. Ён не вельмі клапоціцца пра выразны сцэнічны малюнак, пра логіку ўчынкаў і душэўных перажыванняў героя.

У артыста з'явілася манера «гастралёра» — праспяваў эфектна, а там няхай спектакль ідзе без яго актыўных сувязей з партнёрамі, без яго творчага клопату аб агульным малюнку сцэнічнага твора. Гэта яшчэ называюць «прэм'ерствам», а яно не да твару сур'ёзнаму акцёру-мастаку.

Вобраз Каварадосі ў Бабія атрымаўся статычны, якім мы пабачылі саліста ў першай сцэне, такім ён і пакінуў сцэну. У арыях ён злоўжывае афектацыяй, выконвае іх «з надрывам» — і гэта як раз там, дзе герой Пучыні адчувае трагедыйнасць жыццёвых сітуацый. Спявак такога рангу, як Бабій, павінен усведамляць, што нельга аднолькава ў вакале перадаваць захапленне хараством жанчыны і развітвацца з жыццём!.. Крыўдна пра гэта гаварыць, але выкананне партыі у «Тосцы» Бабій звёў да шэрагу канцэртных нумароў.

Святло і высакароднае імкненне да праўды супроцьпастаўлена ў оперы увасабленню зла — Скарпіа. Злавесны начальнік тайнай паліцыі, гэты чалавек — палітычны і асабісты ворат Каварадосі і яго сяброў.

Саліст У. Генералаў яркай раскрывае халодны цынізм гэтага майстра сыску і інтрыгана. Ён надавычай пераканаўчы ў сцэне з Тоскай у другім акце — каварны і зняважлівы. Праўда, саліст не заўсёды захоўвае чысціню інтанацыі і роўнасць гучання голасу.

Другі выканаўца ролі — А. Генералаў — акрамя агідных рысаў аблічча Скарпіа, падкрэсліваe яшчэ і яго палымяную прагну кахання. Ён хоць і нядобрых, але спавядаецца ў сваім пачуцці шчыра. І яго сутычка з Тоскай — Лебедзевай пакідае вельмі моцнае ўражанне.

Неабходна адзначыць Д. Марозава ў невялікай ролі Рызнічага. Захоўваючы камічнае адценне ў партыі, спявак будуе і пластыку вобраза, зыходзячы з музыкі: яго няроўная хада, канвульсіўныя рухі падказаны музычным малюнкам.

Затое другая эпізадычная роля — роля Чэзарэ Аджэлоці — не ўдалася М. Дружыне. Здаецца, што артысту перашкаджаюць яго цела, рукі, ён механічна-завучана паўтарае позы, якія зусім не адпавядаюць мужнай і парывістай музыцы. Гэтая няўдача тым больш крыўдная, што менавіта з Анджэлоці ў оперу ўліваецца стыхія палітычных страсцей, у якіх і загінулі героі. Нездарма «мяцежная» музычная тэма Анджэлоці неаднаразова гучыць у оперы як сімвалічнае супрацьстаўленне тыраніі.

Выклікаюць пярэчанне некаторыя пастановачныя моманты спектакля (рэжысёр У. Станкевіч). Празмерна стракатае афармленне сабора ў першым акце, а дэкарацыі былі дрэнна замацаваны, і таму «каменныя» скляпенні хісталіся ад нязначнага руху. Абодва выканаўцы ролі Каварадосі апрануты ў блакітныя балетныя трыко. Неверагодна, каб у пачатку XIX стаг

НА ШЫРОКАЙ ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ І ЧАСУ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

Я так падрабязна напамінаю вам гэтыя імёны таму, што лічу — як бы далёка па часе мы ні адыходзілі ад той пачатковай пары, мы ніколі не павінны забываць тых, хто пачынаў, хто ішоў першы.

ЯКІ ПЯРЭСТЫ і разам велічны час — дваццатыя гады нашай літаратуры. Кожны раз, калі я азіраюся назад, на той час, я не магу не здзіўляцца, не гледзячы ні на што, тым, як імкліва, як бурна пачынала наша беларуская савецкая літаратура.

Зборнік вершаў «Завіруха», паэмы «Ленін», «Беларусь лапцюжная», «Чырванакрылы вяшчун» і між іх — самае вышэйшае дасягненне — «Босыя на вогнішчы» Міхася Чарота. Кнігі паэзіі «Па беларускім бруку», «Угрунь», «Фабрыка смерці» і іншыя Андрэя Александровіча. «Там, дзе кіпарысы», «Крэда», «Кругі» Уладзіміра Дубоўкі. Кніга паэзіі «Беларусь бунтарская», паэма «Шанхайскі піўк» Алеся Дудара. «Раніца рыкае» Язэпа Пушчы. Кнігі «Вершы», «Ветры буйныя», паэмы «Астрожнік» і цудоўны «Дзесяты падмурак» Паўлюка Труса, што прамільгнуў, як маланка, на паэтычным небасхіле. Першыя крокі М. Лужаніна, «Шышына» Пятра Глебкі і «Суніцы» дасюль недаацэненага Уладзіміра Хадыкі. Не ўсё аднолькава каштоўна і даўгавечна ў гэтых і іншых кнігах нашай паэзіі, але «Босыя на вогнішчы» і «Дзесяты падмурак» — гэта ўжо адзнакі высокага ўзлёту паэзіі.

Да ўсяго — з'ява надзвычайная, непаўторная — байкі Крапівы. Кніжка за кніжкай: «Крапіва», «Асцё», «Біблія», «Байкі».

Кнігі апавяданняў «У віры жыцця» Міхася Зарэцкага, «Срэбра жыцця» і «Хвоі гавораць» Кузьмы Чорнага, «Дробязі жыцця» Платона Галавача, «Стрэл начны ў лесе» Рыгора Мурашкі былі не толькі першымі спробамі асэнсаваць новае жыццё, але і першымі заяўкамі новых таленавітых людзей у беларускай прозе. Ад кнігі да кнігі развіваліся і мужнелі маладыя пісьменнікі. Праз якія два гады пасля першай кніжкі Платон Галавач даў глыбокую, спелую аповесць «Вінаваты», а Рыгор Мурашка стварыў раман «Сын», што заваяваў шырокую славу ў тагачасных чытачоў. Але асабліва ўпэўнена, моцна разгортваліся Міхась Зарэцкі і Кузьма Чорны. Ярка рамантычная паэма ў прозе «Сцежкі-дарожкі» зрабіла Міхася Зарэцкага адным з прызнаных, вядучых раманістаў Беларусі. Кузьма Чорны не ўражвае так масавага чытача, але творы яго поўныя глыбокага, упартага роздуму над жыццём і чалавекам. К. Чорны за тры гады стварае тры буйныя творы — раманы «Сястра», «Зямля» і аповесць «Лявон Бушмар».

Штогод набірае моц талент Міхася Лынькова, які ўзбагачае нашу літаратуру ўзорнымі, хрэстаматыйнымі апавяданнямі — «Гой», «Над Бугам», «Андрэй Лятун» і іншымі.

Многа новага, незвычайнага прыносіць у нашу літаратуру Янка Маўр. Ён вядзе дапытлівага беларускага юнака ў казачна цікавы, барвісты свет, смела пераступаючы межы канцтынентаў і стагоддзяў. «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Амок» — усё гэта было апублікавана за нейкіх пяць год (з 1925 да 1929 г.).

Выдатнымі поспехамі парадавалі ў гэтыя гады тыя, хто пачынаў яшчэ да Кастрычніка. Калі аглядваеш усё, што яны зрабілі, мімаволі прыходзіць адчуванне: старыя (ім было тады па сорак, гэтым «старым»!) нібы нанава перажылі сваю маладосць. Залатым гэты час быў для Я. Коласа, які стварыў свае лепшыя творы: давяршыў «Новую зямлю», напісаў аповесці «У палескай глушы» і «У глыбі Палесся». Удалым аказаўся для Я. Коласа і «прарыў» у сучаснасць — аповесць «На прасторах жыцця». Плённай была гэта пара і для З. Бядулі: акрамя некалькіх зборнікаў малой прозы, ён даў рамантычнага «Салаўя», што зачараваў многіх маладых чытачоў. У 1929 годзе завяршыў вялікі эпічны твор «Сокі цаліны» Цішка Гартны.

Як і раней, высока ззяла наша слаўная паэтычная зорка — Янка Купала. «Безназоўнае», «Арлянятам», «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Дыктатура працы» — гэта Купалаў голас той пары.

Напісаная ў 1924 годзе паэма «Безназоўнае» — шчырае, узрушанае паэтычнае сведчанне не толькі таго, што жыло ў Купале, але, па сутнасці, і сціслы, абагулены вобраз лепшага ў тагачаснай беларускай паэзіі. Паэма-гімн Купалы ўвабрала ў сябе самыя істотныя клопаты і настрої ўсёй нашай паэзіі.

Цікава — паэма «Дзесяты падмурак» аднаго з маладзейшых паэтаў тых гадоў Паўлюка Труса і агульным настроем, і многімі матывамі нібы перакліканецца з «Безназоўным» Купалы. Невыпадковая, красамоўная гэта блізкасць, якая быццам адбіла блізкасць розных пакаленняў беларускай паэзіі 20-х гадоў.

Паэзія той пары была багатая не толькі на вялікія грамадскія тэмы, яна не цуралася і інтымнай лірыкі. Гэта была паэзія шырокага водгуку жыцця, розных, багатых пачуццяў.

Сатыру нашу бліскуча вёў Кандрат Крапіва. Многа добрага для паэзіі і для народа зрабілі байкі Крапівы, што дакладна білі па невуцтву, па аслах, якія хацелі б засланіць сонца, па бабах, што памагаюць, седзячы на возе. «Сука і збане», «Дзед і баба», «Жаба ў каляіне», «Мандат» і многія іншыя байкі Крапівы заваявалі сэрцы мільёнаў людзей па ўсёй Беларусі.

Прайшлі дзесяткі гадоў, за Крапівой вырас цэлы атрад паслядоўнікаў, але байкі яго і цяпер жывуць ва ўсёй сіле.

Багатая фарбамі і думкамі, багатая віраваннем народнага жыцця, беларуская літаратура станавілася ўсё больш моцнай, неабходнай часткай духоўнага жыцця народа.

БАГАТАЙ вопытам, дужаю выйшла наша літаратура на рубяжы трыццатых гадоў. На рубяжы складанага часу, сур'ёзных выпрабаванняў.

Ішла індустрыялізацыя. Пачалася масавая калектывізацыя. Была складаная расстаноўка класавых сіл. Была рэальная пагроза з-за мяжы: блізка ад Мінска, у двух дзесятках кіламетраў, пачыналася варожая белая Польшча. Памяць трывожылі яшчэ блізкія, вострыя ўспаміны пра нямецкую і польскую акупацыю. І ўжо рэальнымі праявамі гразіўся з Італіі, з Германіі фашызм.

Літаратура жыла, працавала на карысць народа. Перад самым трыццатым годам выдаў сваю першую аповесць «Затока ў бурах» Янка Скрыган, ён пазней напісаў па гарачых слядах жыцця некалькі кніжак нарысаў і апавяданняў — «Шугае сонца», «Сустрэчы» і іншыя. Заявіў пра сябе як пра ўдумлівага, назіральнага пісьменніка аповесцю пра калектывізацыю «Межы» Сымон Баранавых. На тое, што адбывалася ў вёсцы, чула адгукнуўся К. Чорны, напісаўшы аповесць «Вясна». З поспехам у новай для сябе галіне шырокай прозы выступіў К. Крапіва: раман «Мядзведзічы» ўзбагаціў літаратуру сур'ёзным даследаваннем жыцця вёскі. Нямала цікавага расказалі чытачам раман М. Лынькова «На чырвоных лядах» і яго аповесць «Апошні зверыядавец» — на той час вельмі актуальная па накіраванасці сваёй, закліку да пільнасці. Горача была прынята чытачом і крытыкай злабадзённая па тэме — калектывізацыя ў вёсцы — аповесць П. Галавача «Спалох на загонах». П. Галавач стварыў у гэтыя гады і першы свой раман — у цэлым удалы, сур'ёзны эпічны твор «Праз гады». Суровым рэалізмам і мужнай глыбінёй вылучаецца лепшы твор М. Зарэцкага «Вязьмо» — можа быць самы глыбокі твор тых часоў пра калектывізацыю.

Шырокім роздумам над часам, над рухам гісторыі вызначаюцца раманы К. Чорнага «Бацькаўшчына», «Трыццаць год», потым — «Трэцяе пакаленне» і аповесць «Люба Лук'янская».

Час гэты адзначан прыходам у беларускую драматургію выдатнага аўтара — К. Крапівы. Крапіва паказаў немалое майстэрства ўжо ў першай п'есе «Канец дружбы», а другая п'еса «Партызаны» стала радаснай з'явай ва ўсёй беларускай драматургіі.

Актыўна, усё больш упэўнена заяўляў пра сябе ў паэзіі П. Броўка. Аўтар кніг «Прамова фактамі», «Гады, як шторм», «Цэхавыя будні» ў 1932 годзе стварыў паэму «Праз горы і стэп», якая была, можна сказаць без перабольшання, дасягненнем усёй тагачаснай паэзіі. Акрамя зборнікаў «Хада падзей» і «Чатыры вятры» П. Глебка напісаў адзін з лепшых сваіх твораў — публіцыстычна-філасофскую паэму пра Леніна, пра ленінскую справу — «Мужнасць». Тэму гэтай паэмы ён потым развіне ў паэме пра Кастрычнік «У тыя дні».

Вельмі энергічна працуе ў гэтыя гады ў паэзіі М. Лужанін, пра што добра сведчыць цэлая бібліятэчка яго паэзіі, выдадзеная за некалькі гадоў — зборнікі «Неаплочаны рахунак», «Аднагалосна», «Кастрычнікам, ліпенем, маем» і інш.

Добры плён у паэзіі першай паловы трыццатых гадоў мелі — Уладзімір Хадыка, Мікола Хведаровіч, Сяргей Дарожны, Змітрок Астапенка і многія другія.

Але самае высокае дасягненне нашай паэзіі тых гадоў паэма Янкі Купалы «Над ракой Арэсай» — усхваляваная песня стваральнай працы чалавека, камуны, сацыялізма, што павялі наступленне на палескую багну, на санлівую мінуўшчыну.

ТРЫЦЦАТЫЯ гады прынеслі ў наша жыццё і многа горкага, трагічнага. Усё гэта вядома. Але ніколькі не аслабляючы значэння змрочных з'яў, якія былі ў трыццатыя гады, у імя справядлівасці, праўды мы не можам не бачыць, што ў праўдзе тых гадоў была і іншая, светлая, сацыялістычная рэчаіснасць.

Многае і на добрае змянялася ў нашых вёсках. У калгасы ішла тэхніка, ішла культура. Прамысловасць хутка змяняла воблік гарадоў. Спраўджвалася мара П. Труса: наша краіна станавілася «краем фабрык дымных і машын». Моладзь цягнулася да ведаў. Аўдыторыі інстытутаў звінелі маладымі галасамі.

У тыя ж трыццатыя гады адбылася вельмі важная і вельмі патрэбная падзея: была ліквідавана дробная цераспалосіца ў пісьменніцкіх арганізацыях і створан адзіны Саюз савецкіх пісьменнікаў — наша цяперашняя арганізацыя.

У 1934 годзе адбыўся першы з'езд савецкіх пісьменнікаў, які стаў падзеяй не толькі ў літаратуры, а і ў жыцці ўсяго народа.

Для нас, беларусаў, асабліва шчаслівым аказаўся трыццаць дзевяты год, другая палова верасня. Ажыццявілася даўняя наша мара, прыціх даўні боль — нашы заходнія браты з'ядналіся з намі. Вызваленне расчыніла турэмныя дзверы перад П. Пестраком, увяло ў нашу сям'ю М. Танка, В. Таўлая, М. Машару, Н. Тарас і іншых нашых таварышаў.

Другая палова трыццатых гадоў парадавала нас цудоўным ляўкоўскім цыклам Я. Купалы. Вельмі хораша раскрыўся талент А. Куляшова — нас зачаравалі тады яго «Юнацкі свет» і паэма «У зялёнай дуброве». У тыя гады К. Крапіва стварыў «Хто смяецца апошнім» — сатырычную камедыю, якая дасюль, па-мойму, застаецца лепшым творам савецкай літаратуры ў гэтым жанры.

У гэтыя гады ў парадзелым лесе нашай літаратуры хутка вырасла, развілося новае яркае дрэва — Эдуард Самуйлёнак. «Палаўнічае шчасце», «Будучыня», «Пагібель воўка» — гавораць, які гэта быў шматабяцаючы талент. Шкада, што гэтае прыгожае дрэва спаліла так рана хвароба.

І яшчэ адно маладое дрэва адразу хораша зазелянела — Пімен Панчанка. Добра, плённа працаваў Макар Паслядовіч, аўтар аповесці «Магістральны канал» і рамана «Паўстанне». Нарэшце, убачыла святло першая кніга паэзіі П. Пестрака «На варце», кніга, напісаная ў казематах белапольскіх турмаў.

Рос, набіраў сілы малады падлесак — А. Жаўрук, А. Ушакоў, У. Краўчанка, А. Бялевіч, Э. Агняцвет, А. Астрэйка, А. Бачыла, Р. Бярозкін, Р. Няхай, І. Грамовіч, К. Кірэенка, М. Аўрамчык. Жыццё брала сваё.

НАША зямля першая прыняла на сябе шалёны наскок вайны. Мы чакалі яе, і ўсё ж яна абрынулася на нас неспадзявана і страшна, вайна 1941 года. Нам было неймаверна цяжка. Асабліва ў 1941 годзе. Вайна выпрабоўвала нас самай жорсткай, бязлітаснай пробай. Нашу стойкасць, меру нашай адданасці Савецкай уладзе, справе Леніна.

Найгалоўны пісьменніцкі абавязак тады быў — узяць зброю, знайсці сваё месца ў вялікім змаганні. І мы знайшлі. Адны ў армейскіх падраздзяленнях — Мікола Аўрамчык, Васіль Барысенка, Леанід Гаўрылаў, Алесь Жаўрук, Аляксей Кулакоўскі, Мікола Лупсякоў, Хаім Мальцінскі, Пімен Панчанка, Іван Шапавалаў. Апранулі армейскія шынялі старэйшыя — Лынькоў, Крапіва, Гурскі — супрацоўнікі рэдакцыі газеты «За свабодную Беларусь», што выдавалася на Калінінскім фронце.

Адзначым з ухвалай: добраахвотна, кіруючыся грамадзянскім абавязкам, пайшлі ў варожы тыл, да партызан, Антон Бялевіч, Анатоль Астрэйка, Сцяпан Майхровіч. Закінуты ваеннай доляй на Украіну, з годнасцю падтрымліваў гонар беларусаў у партызанскіх атрадах Ю. Збанацкага Рыгор Няхай. Сярод пінскіх партызан быў Піліп Пестрак, на Брэстчыне партызаніў Мікола Засім, у Налібоцкай пушчы — Янка Брыль. У падполлі, у партызанскіх атрадах праходзілі незвычайную чалавечую і пісьменніцкую падрыхтоўку Іван Навуменка, Алесь Адамовіч, Аляксей Карпюк, Георгій Шчарбатаў.

Ужо ў першыя дні вайны беларускі народ пачуў голас нашай паэзіі. Энергія, народжаная напалам народнай барацьбы ў нашай паэзіі, выключная. Толькі незвычайная энергія, толькі поўная элітнасць з народам, з яго бядой і яго надзеяй маглі нарадзіць у франтавой зямлянцы такую выдатную, вялікую рэч, як паэма А. Куляшова «Сцяг брыгады».

У нашай паэзіі ваеннай пары багата чым мы маем права заўсёды ганарыцца: тут і лірыка А. Куляшова і М. Танка, і прачулая, пафасная «Беларусь» П. Броўкі, і «Слуцкі пояс» А. Астрэйкі, і высокая паэзія В. Віткі, і народная краса вершаў А. Бялевіча.

Трэба аддаць знакі пашаны нашай паэтычнай сатыры, той, якая са старонкамі баявой газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну» ішла ў самалётах у партызанскія лясы і хаты.

Проза наша гучала, здаецца, не так моцна. Але і яна рабіла, што магла: варта ўспомніць вострыя памфлеты К. Чорнага ў кнізе «Кат у белай манішцы»; такія выдатныя навелы, як «Васількі», «Дзіцячы башмачок» і іншыя М. Лынькова; «Маленькая жанчына» і «Вялікае сэрца» К. Чорнага. Не будзем забываць і пра тое, што К. Чорны пісаў у гэты час «Пошукі будучыні» і іншыя раманы, а М. Лынькоў патаемна рыхтаваў аснову «Векапомных дзён».

Вайна многа ўзяла ад нас. Не вярнуліся ў Мінск з ваеннага выгнання Я. Купала і З. Бядуля. На шырокіх прасцягах вайны пад Ленінградам і Сталінградам, пад Кенігсбергам і Берлінам аддалі сваё жыццё за радзіму, за наш сённяшні дзень многія нашы сябры, якія так багата маглі б зрабіць у літаратуры.

Яны выканалі свой абавязак да канца. Слава ім і вечная — сумная і ўдзячная — наша памяць!

ЯБЫЎ адным з тых, хто ў канцы 1944 года ў Мінску разам з П. Броўкам складаў першы нумар часопіса «Полымя» на год 1945.

У першы дзень міру — 10 мая 1945 года трое нас — Я. Брыль, П. Кавалёў і я — былі прыняты ў Саюз пісьменнікаў. Прыняты без цвёрдых падстаў — больш на падставах спадзяванняў, у мяне было толькі тры-чатыры апавяданні.

Нас было вельмі мала. Нас чакалі нецярпліва, прымалі з радасцю. А людзі ішлі, здавалася, павольна. З вялікімі прамежкамі адзін ад аднаго. Вайна скончылася, а многія яшчэ былі патрэбны арміі. Помню, як прыязджалі ў ваеннай форме, пры пагонах і ордэнах, А. Бачыла, Я. Казека, М. Калачынскі, І. Грамовіч, П. Панчанка. Помніцца першая, армейская работы падборка вершаў А. Русецкага ў «Ліме».

Тоненькія былі нашы першыя кніжачкі: «Ранак ідзе» К. Кірэенкі, «Поўдзень» В. Віткі, «У атаку» М. Лупсякова.

Цяжкі быў пачатак. Уся наша родная зямля крывавілася свежымі ранамі. Вёскі чарнелі жахлівымі выгарамі, ледзь не ў кожнай людзі ціснуліся, гібелі ў зямлянках. Ледзь не ўсе гарады ляжалі ў руінах, заводы сустракалі цішынёй, пустэчай.

Мала было коней у калгасах, не хапала насення, не хапала цвікоў, будматэрыялаў, прадуктаў харчавання. Мільёны людзей жылі голадна і холадна.

Гэта было наша жыццё. Але ў гэтым была толькі палова праўды. Другая палова праўды, больш глыбокая, была ў тым, што гэта быў таксама час вялікіх надзей і вялікай радасці. Вайна скончылася, быў мір, а мірнае жыццё абяцала нам бясконца багата.

Памыляецца той, хто думае, што аптымізм людзей таго часу — прыдуманы паэтамі. Аптымізм гэты ішоў ад жыцця, ад таго, што яно было поўна спадзяванняў і веры.

І надзвычайны, дзівосны энтузіязм — не выдуманы. Гэта таксама адзнака часу. І шырыня, смеласць задум — таксама ад таго часу, ад адчування велічы, прастору, што быў перад намі. Ды яшчэ ад маладосці — многіх з нас і краіны, якая нібы перажывала другую сваю маладосць.

Літаратура жыла вельмі злітна з жыццём народа. Усё, што поўніла яе, — гэта памяць нядаўняй вайны і нецярплівае жаданне залячыць жахлівыя раны.

Гэта ва ўсіх кніжках той пары, тых, якія напісаны старэйшымі, тых, якія належалі маладым, што толькі ўваходзілі ў літаратуру. Пры ўсёй рознасці творчых асаблівасцей гэта яднае ўсю тагачасную паэзію — творы П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна, А. Бялевіча, М. Калачынскага, К. Кірэенкі. Хораша на гэтай першай пасляваеннай хвалі вяршы ўзыходзілі Я. Брыль, А. Вялюгін, М. Лупсякоў, І. Грамовіч, потым А. Кулакоўскі, І. Шамякін, М. Аўрамчык, А. Русецкі, А. Васілевіч.

Літаратура хутка набірала сілу. Добра бачачы мастацкую недасканаласць некаторых твораў, нельга не адзначыць таго, як упарта імкнулася наша літаратура ісці ў нагу з жыццём, даваць чытачам буйныя па вобразах, па ахопу жыцця творы. Паэмы П. Броўкі і А. Куляшова, аповесці Я. Брыля і А. Кулакоўскага, раманы І. Шамякіна, Т. Хадкевіча, сатыра А. Макаёнка і У. Корбана могуць належным чынам паказваць характар думак і творчых імкненняў большасці пісьменнікаў таго часу.

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе адзначаецца асабліва бурным ростам прозы. Іменна ў гэты час наша літаратура ўзбагацілася такімі моцнымі, выдатнымі творамі, як «Сустрэнемся на барыкадах» Піліпа Пестрака і «Векапомныя дні» М. Лынькова. У гэтыя гады завяршыў і кнігу ўсяго свайго жыцця — трылогію «На ростанях» Я. Колас.

Не прыніжаючы таго добрага, што было зроблена, мы, аднак, не маем права заплюшчваць вочы і на тое, што не ўсё рабілася, як належыць і не ўсё таму вытрымала выпрабаванне часам.

У. І. Ленін вучыў нас уважліва адносіцца да вопыту мінулага, сур'ёзна аналізаваць прычыны і нашых поспехаў і нашых няўдач, вучыў з няўдач рабіць неабходныя для далейшай работы вывады.

Азіраючыся назад, не магу перш за ўсё не адзначыць таго, што не заўсёды работа нашых таварышаў ішла ў добрай, спрыяльнай для творчасці абстаноўцы. Нельга не згадаць са шкадаваннем, што ў першае дзесяцігоддзе пасля вайны светлы абсяг нашай літаратуры не раз зацягвалі сінія, часам цёмныя хмары.

Вялікую шкоду прынесла нам і неразуменне некаторымі дзеячамі, што займаліся літаратурай, спецыфікі літаратуры. Думаю, адсюль пайшло гэта імкненне як мага ўзбагаціць мастацкую літаратуру вытворчымі сакрэтамі, накшталт таго, як рабіць торфа-перагнойныя гаршчочкі і як вырошчваць «кок-сагыз».

Адсюль, ад неразумення спецыфікі літаратуры, мусіць, ідзе і непераважны яшчэ погляд на літаратуру як на фатаграфічную ілюстрацыю ўсяго таго, што адбываецца ў жыцці. Погляд, які стаў прычынай прыкметнай заганы шэрагу твораў нашай літаратуры — ілюстрацыйнасці.

Адно з самых вялікіх абвінавачанняў, якое кідаў У. І. Ленін камуністам, было абвінавачанне ў пражэкцёрстве. У. І. Ленін заўсёды заклікаў лічыцца з рэальнасцю, выходзіць з яе. Не можам сказаць, што мы былі зусім бязгрэшныя і ў гэтых адносінах.

Помню, тады, недзе на рубяжы пяцідзесятых гадоў, мала было такіх, каго б не захапіла новае «адкрыццё» — новая прырода канфлікту: добрае змагаецца з лепшым. Пад гэтае адкрыццё была падведзена і «грунтоўная» тэарэтычная база. Такога ж роду, са сваёй логікай і сваёй абгрунтаванасцю, былі развагі пра тое, што асноўным героем савецкай літаратуры павінен стаць герой, якога ўпершыню нарадзіў наш час — ідэальны герой.

У новых ідэй заўсёды ёсць свая прываблівасць. Дайшла да сэрцаў многіх з нас і гэтая, тым больш, што яна адпавядала патрыятычнаму імкненню бачыць усё ў добрым, прыгожым святле. Імкненню бачыць тое, пра што марыцца ўжо рэальным. Так нарадзілася тая якасць у некаторых нашых творах, якую потым назвалі лакіроўкай рэчаіснасці.

Гаворачы гэта, я лічу патрэбным сказаць і пра тое, што калі шкодны літаратуры ружовы лак, то не мае яна патрэбу і ў чорным. Літаратуры не патрэбны ніякія лакі, ёй патрэбны натуральныя, жывыя колеры. Колеры жывога жыцця. У гэтым яе сіла і яе характар.

ПЕРАХОДЗЯЧЫ да літаратуры сярэдзіны 50—60-х гадоў, я перш за ўсё хацеў бы адзначыць, што ў другой палове пяцідзесятых гадоў нашу сям'ю папоўніла група пісьменнікаў, што былі на доўгія гады адарваны ад роднай зямлі, ад творчай працы. Іх вярнуў у нашу сям'ю XX з'езд партыі. Вельмі добра гэта, што яны ў нашай сям'і, што яны шчыра працуюць, радуюць нас маладой энергіяй і жыццялюбствам. Яны заслужылі права на вялікую павагу — Я. Скрыган, С. Грахоўскі, М. Хведаровіч, У. Дубоўка, Р. Бярозкін, А. Звонак, А. Пальчэўскі, С. Шушкевіч, Ю. Гаўрук, Я. Бяганская.

У гэтыя гады ў нашы рады ўлілося новае пакаленне, вельмі блізкае па жыццёваму вопыту да першага пасляваеннага. Усё гэта людзі, якія таксама зазналі вайну, горыч страт і радасць перамогі, але па розных прычынах прыйшлі ў літаратуру трохі пазней. А. Асіпенка, І. Навуменка, В. Быкаў, А. Карпюк, А. Пысін, А. Адамовіч, С. Александровіч, А. Савіцкі, І. Новікаў, Л. Арабей, А. Бажко, Е. Лось, В. Каваленка, П. Дзюбайла — шматлікае і багатае талентамі гэтае пакаленне, многія прадстаўнікі якога добра вядомы цяпер не толькі беларускаму чытачу.

Цяпер ужо значны плён у тых, каго мы яшчэ нядаўна называлі маладымі і якія ўжо добра ўзбагацілі нашу літаратуру сваім вопытам і сваім разуменнем свету. Мы бачым як арыгінальных, сталых мастакоў лепшых з іх, такіх, як Р. Барадулін, Н. Гілевіч, А. Вярцінскі, Г. Бураўкін, В. Зуёнак, Р. Тармола, Д. Бічэль-Загнетава, Я. Сіпакоў, І. Пташнікаў, Б. Сачанка, М. Стральцоў, В. Адамчык, І. Чырынаў, У. Паўлаў, А. Грачанікаў.

Нас не можа не радаваць, што ў нас нямала здольных людзей сярод тых, хто зусім малады, хто толькі пачаў ці пачынае. Юрка Голуб, Рыгор Семашкевіч, Жэня Янішчыц, Алесь Разанаў, Вольга Іпатава і многія іншыя — гэта тыя, з кім звязваем нашы добрыя надзеі на будучыню.

ПАЧАТАК гэтага перыяду развіцця літаратуры адзначан вельмі важнай падзеяй — работай XX з'езда КПСС. Рашэнні XX з'езда, якія сурова, з ленінскай прынцыповасцю асудзілі некаторыя нездаровыя з'явы мінулага, расчысцілі дарогу да імклівага развіцця нашага грамадства ва ўсіх галінах жыцця. Яны выключна плённа адбіліся і на нашай літаратуры, якая ў шэрагу твораў узнялася на новы якасны ўзровень.

Гаворачы пра нашы здабыткі ў гэты час, павінен перш за ўсё адзначыць высокія вартасці такіх буйных твораў, як «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча, «Шэметы» М. Лобана, «Серадзібор» П. Пестрака, творы, якія глыбока і праўдзіва даследуюць вытокі нашай сучаснасці. Побач з гэтымі творамі з поўным правам можна паставіць шчырую, сардэчную трылогію Р. Сабаленкі «Іду ў жыццё», тонкую, паэтычную аповесць М. Стральцова «Адзін лапаць — адзін чунь». Значна ўзбагацілі мастацкі летапіс Вялікай Айчыннай вайны яркія, суровыя, поўныя роздуму над перажытым аповесці В. Быкава «Трэцяя ракета» і «Альпійская балада», раманы І. Навуменкі «Сасна пры дарозе» і «Вецер у соснах», «Расстаёмся ненадоўга» і «Сустрэчы на ростанях» А. Кулакоўскага, «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» А. Адамовіча, «Вогненны азімут» А. Асіпенкі, аповесці «Тартак» І. Пташнікава, «Апошнія і першыя» Б. Сачанкі.

Трэба адзначыць як цікавую і важную падзею ў нашай прозе нядаўніх год раман-споведзь Я. Брыля «Птушкі і гнёзды». Раман Я. Брыля значна ўзбагаціў яшчэ беднаватую ў нашай літаратуры тэму інтэрнацыянальнага братэрства нашых людзей з народамі іншых краін.

Хочацца адзначыць як прыемную з'яву прыкметны творчы рост Л. Арабей, што напісала некалькі цікавых твораў аб вайне, якія хвалююць праўдай перажытага.

Завяршыў днямі шматгадовы свой клопат І. Гурскі — закончыў тэтралогію «Вецер веку». Нямала цікавага знойдзе наш чытач у двух раманах «Сонца за кратамі» і «Крэсы змагаюцца» М. Машары — пра рэвалюцыйнае змаганне ў Заходняй Беларусі. Хочацца асабліва парадавацца за С. Грахоўскага, першы буйны твор якога ў прозе «Рудабельская рэспубліка» стаў прыкметнай з'явай нашай літаратуры. З карысцю для народа працаваў ў гэтыя гады І. Новікаў, аўтар змястоўных, багатых яркімі фактамі кніг пра гераізм беларускіх партызан, мінскіх і віцебскіх падпольшчыкаў.

Парадаваў нас добрым і таксама вельмі рэдкім у нас па жанравых асаблівасцях, па-сапраўднаму таленавітым творам «Колас расказвае пра сябе» М. Лужанін. Хочацца падтрымаць добрым словам тое, што робіць у гэтай галіне Я. Скрыган і М. Хведаровіч, і тую цяжкую, карпатлівую, але надзвычай важную для ўсёй літаратуры работу, якую робяць нашы нястомныя даследчыкі С. Александровіч, Г. Кісялёў, А. Мальдзіс.

Ёсць у прозе паўныя поспехі і ў асваенні нашай блізкай, імклівай рэчаіснасці. Нібы яднае ўчарашні і сённяшні дзень раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні», што заваяваў шырокую папулярнасць у савецкіх чытачоў. Як вядома, нядаўна І. Шамякін апублікаваў новы раман «Снежныя зімы». Тэме пасляваеннага аднаўлення і сучаснага гарадскога жыцця прысвяціў свае раманы «За годам год» і «Вясеннія ліўні» У. Карпаў. З творамі, прысвечанымі актуальным праблемам нашай вёскі, выступіў А. Савіцкі.

Без усякіх скідак высока варта ацаніць мужную, строгую аповесць А. Асіпенкі «Абжыты кут», драматычныя, вельмі сур'ёзныя апавяданні І. Пташнікава, сабраныя ў кнізе «Сцяпан Жыхар са Сцешыц», лепшыя апавяданні В. Адамчыка, М. Стральцова, І. Навуменкі. Варта ўхваліць першыя крокі нашых маладзейшых аўтараў А. Кудраўца, М. Капыловіча, В. Карамазава.

Хачу асабліва адзначыць з'яўленне ў нашай прозе цікавых нарысаў В. Палтаран, В. Мыслівца, Я. Сіпакова. Думаю, што не толькі нарысы «Дзівасіл» і нарысы, сабраныя ў кнізе «Ключы ад сезама» В. Палтаран, якія ўжо належна ацэнены нашай крытыкай, але і нарысы В. Мыслівца і Я. Сіпакова заслугоўваюць і бясспрэчнай ухвалы і нашай павагі. Думаю, што мы недаацанілі ў свой час значэнне таго, што зрабіў у беларускай прозе Ігнат Дуброўскі.

У гэты юбілейны год з асаблівай увагай мы азіраем тое, што зрабіла наша літаратура, каб увасобіць у мастацкіх творах вобраз У. І. Леніна. Наша проза не першы год спрабуе рашыць гэтую пачэсную задачу. Вобраз У. І. Леніна малявалі ў сваіх творах З. Бядуля, І. Гурскі, В. Хомчанка, над творамі пра Леніна настойліва працуе цяпер І. Шамякін. Багата больш зрабіла тут паэзія, наша паэтычная ленініяна мае рад добрых, высокай вартасці твораў. Сярод іх — паэма А. Вялюгіна «Вецер з Волгі», драматычныя паэмы П. Глебкі, вершы М. Танка, П. Броўкі, многіх іншых паэтаў. Прыемна адзначыць нядаўні поспех у стварэнні вобраза У. І. Леніна ў драматургіі, якога дасягнуў К. Губарэвіч, аўтар п'есы «Брэсцкі мір». Усё-такі тут, асабліва ў прозе, нам трэба яшчэ працаваць і працаваць.

ВЕЛЬМІ пабагацела галасамі за гэты час наша паэзія. Сённяшнюю беларускую паэзію проста немагчыма ўжо ўявіць без яркай і, я сказаў бы, дзёрзкай сваёй думкай і мовай паэзіі Р. Барадуліна, без філасофска-раздумлівых паэм С. Гаўрусёва, без добрай, разумнай яснасці лірыкі Н. Гілевіча, без тэмпераментнай, гарачай споведзі паэзіі Г. Бураўкіна, без стрыманай і ўдумлівай лірыкі В. Зуёнка. Нямала ўзбагацілі гучанне, шырокі свет нашай паэзіі і некаторыя іншыя іх таварышы, якіх я не магу адзначыць толькі таму, што абмежаваны часам.

У гэтыя ж гады хораша і моцна загучалі галасы А. Русецкага, М. Аўрамчыка, А. Пысіна, якія выйшлі ў першыя рады нашай паэзіі. Гэта цяпер сталыя, своеасаблівыя паэты, якія сур'ёзна думаюць над сённяшнім нашым жыццём і багата разумнага гавораць людзям.

Наогул, наша паэзія многа думае пра сённяшні дзень. Аб гэтым сведчаць самыя апошнія цыклы паэтычных твораў М. Танка, П. Броўкі, М. Лужаніна, К. Кірэенкі, А. Бялевіча, М. Калачынскага, П. Макаля, Е. Лось, А. Лойкі, апублікаваны ў кнігах і часопісах.

Наша нязменная трывога — драматургія. На сцэнах тэатраў з поспехам ідуць п'есы А. Маўзона, А. Макаёнка, К. Губарэвіча, «Выклік багам» А. Дзялендзіка. Нямала зрабілі ў дакументальным кіно А. Вялюгін, у мастацкай кінематаграфіі А. Куляшоў і М. Лужанін. У оперным драматургіі не першы год працуе А. Бачыла. Усё ж стан драматургіі ні ў якім разе не можа нас задаволіць, стан гэты, трэба сказаць, проста крытычны. Калі п'ес для тэатра мала, то драматургіі для тэлебачання наогул няма.

Вы ведаеце, якую вялікую ўвагу наша партыя і наш урад надае развіццю дзіцячай літаратуры. Тут у нас добра працуюць А. Якімовіч, В. Вітка, П. Кавалёў, Т. Хадкевіч, Э. Агняцвет, В. Вольскі, А. Пальчэўскі, А. Шашкоў, многія вядомыя паэты і празаікі. І ўсё ж тут не першы год адчуваецца ўжо, можна сказаць, хранічны голад на цікавыя, карысныя кнігі.

Ёсць што рабіць і нашай крытыцы. Тут галоўнае, што належыць зрабіць, у тым, каб удасканаліць ідэйныя і мастацкія крытэрыі пры вызначэнні шляхоў развіцця літаратуры, яе асобных жанравых і тэматычных плыняў, асаблівасцей працы асобных пісьменнікаў, характару канфліктаў і праблем. Не можам сказаць, што ўсё ў гэтых адносінах у крытыцы добра. Але якія ні значныя нашы патрабаванні да сённяшняй крытыкі, мы не можам заплюшчваць вочы на тое, што яна нямала зрабіла. Варта адзначыць артыкулы і кнігі Р. Бярозкіна, Н. Пашкевіча, Р. Шкрабы, У. Юрэвіча, В. Каваленкі, У. Калесніка, Д. Бугаёва. Наш добры набытак у галіне літаратуразнаўства — такія капітальныя работы, як кніга «Праблемы сучаснай беларускай прозы», напісаная П. Дзюбайлам, В. Жураўлёвым і М. Луферавым, і «Гісторыя беларускай літаратуры» ў 4 тамах. «Гісторыя» — першая за ўвесь наш час такая падрабязная, сістэматызаваная, прадуманая карціна развіцця літаратуры. Немалую і важную работу зрабілі нашы таварышы — супрацоўнікі Інстытута літаратуры Акадэміі навук.

Як своеасаблівую і цікавую з'яву можна згадаць дзве кнігі аўтабіяграфій пісьменнікаў — «Пяцьдзесят чатыры дарогі» і «Пра час і пра сябе», якія многім абавязаны клопату і цярплівасці Я. Казекі.

Усяго некалькі дзён назад адбылася вельмі значная падзея ў нашым культурным жыцці — выйшаў першы том Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Энцыклапедыя выходзіць, як вы ведаеце, пад кіраўніцтвам П

З ПЕСНЯЙ ХОРАША І Ў ДАРОЗЕ, І ДОМА...

СУСТРЭЧА АРТЫСТАЎ ГОМЕЛЬСКАЙ ФІЛАРМОНІІ З РЭДАКЦЫЯЙ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Усё было незвычайна ў тую раніцу. Не спяшаліся к Дому мастацтваў людзі, не тоўпіліся ля ўваходу, і ў гардэробе вісела толькі з тузін паліто... Але ж ці то мы былі настроены на нейкую асаблівую хвалю, ці то ў паветры насіліся флюіды — вестуны чагосьці радаснага і прыемнага, але ўсё гэта адразу «чыталася» яшчэ ўнізе, у вестыбюлі.

Мы сядзім у адной з гасціных Дома мастацтваў — група артыстаў Гомельскай філармоніі і супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва».

Мастацкі кіраўнік Яўгенія Іконнікава.

— Мы вельмі рады гэтай нашай сустрэчы, — сказаў, калі мы ўжо развіталіся, дырэктар філармоніі Андрэй Аркадзьевіч Бабылькоў. — Такія сустрэчы сагреваюць, павышаюць тонус, ці што, ствараюць настрой, якога нам, артыстам, іншы раз, як свежага ветрыка, не хапае...

Гомельская філармонія мінула два гады. Гэта самая маладая філармонія не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй краіне. Несумненна, ствараецца яна ў добры час. Духоўны ўзровень нашых людзей значна ўзрос, і гэта дае права рэжысёрам, музыкантам, выканаўцам на пошук-эксперымент, дае магчымасці ствараць праграмы, разлічаныя на культурнага, інтэлектуальнага гледача і слухача. Але разам з тым, значна ўзраслі і патрабаванні да акцёра. Сённяшні глядач чула і дакладна рэагуе на ідэйна-мастацкі ўзровень выканання, не прымае ўсякага роду заляжалы «тавар», нецярпімы да халтуры. Сённяшні глядач не дарэ ні фальшу, ні кампрамісаў у мастацтве. І натуральна, што яму няма справы, колькі гадоў існуе той ці іншы калектыў, малады ён альбо стары. У любым выпадку ён павінен быць у першую чаргу высокапрафесіянальным, несці ў масы добры зарад грамадзянскасці, адкрываць перад тымі, хто сядзіць у зале, новыя гарызонты.

Дырэктар Андрэй Бабылькоў.

Аб гэтым ішла размова на сустрэчы. Аб планах і надзеях маладой філармоніі гаварыў Андрэй Аркадзьевіч Бабылькоў. Натуральна, што свой расказ ён пачаў з таго, як філармонія рыхтуецца да ленінскага юбілею.

— З вялікіх задумак і планаў тое-сёе ўжо зроблена. Вось, напрыклад, «Гомельскі сувенір» — так называецца наш самы буйны калектыў. Ім падрыхтаваны спектакль-канцэрт «Усім, усім, усім...» з двух аддзяленняў: «Вечны агонь» і «Песня мая», у якім гучыць музыка такіх выдатных савецкіх кампазітараў, як Дзмітрый Шастаковіч, Ісак Дунаеўскі, Васіль Салаўёў-Сядой, гучаць вершы Міхаіла Святлова, Яўгенія Далматоўскага, Уладзіміра Карнілава... Напружана працуюць і іншыя калектывы.

Але работы не меншае. Мы лічым, што наша асноўная задача — прапаганда музыкі на сяле. І ў сувязі з гэтым не магу не сказаць аб тым, што набалела. У Гомельскай вобласці — 500 сельскіх клубаў. Але ў гэтых клубах, на жаль, вельмі мала інструментаў. Людзі нашы жывуць добра, калгасы нашы багатыя. І магчымасць набыць інструменты ў іх ёсць. Тады ў чым жа справа? А ў тым, што не ўсе яшчэ кіраўнікі калгасаў зразумелі значэнне прапаганды музыкі. Не ўлічваюць часам, што сустрэча з цудоўнымі творамі музыкі здольна зрабіць больш, чым іншая лекцыя.

Калі гаварыць аб праблемах вялікіх і малых, дык іх у нас, відаць, не больш і не менш, чым у іншых канцэртных арганізацыях: праблема кадраў, напрыклад. Выканаўцаў таленавітых, адораных, цікавых шмат. Але для таго, каб чалавек застаўся ў нас, у Гомелі, мы павінны стварыць яму спрыяльныя ўмовы. А гэта не заўсёды ад нас залежыць; праблемай нумар адзін застаюцца для нас рэпетыцыйныя памяшканні. Некалькі пакояў пад дахам, дзе сёння размясцілася філармонія, шчыра скажам, ні ў якім разе не могуць вырашыць гэтую праблему...

Спявачка Юлія Казлова.

Андрэй Аркадзьевіч з задавальненнем, з нейкай нават гордасцю прадставіў нам музыкантаў — эстрадны калектыў, які называецца «Песні над Сожам». Артысты ўзрадаваліся, што, нарэшце, атрымалі права «гаварыць» на сваёй цудоўнай мове музыкі і зайгралі вясёлую народную жартоўную мелодыю... Яны зусім маладыя, гэтыя хлопцы з эстраднага калектыву «Песні над Сожам» і іграл з запалам, гарэзліва, весела. Маленькую гасціную Дома мастацтваў запоўнілі гукі балалайкі, мандаліны, гармоніка.

Цяжка сказаць, якую форму набыў бы цяпер, у нашых умовах, калектыў самаахвярнага прапагандыста мастацтва Ігната Буйніцкага, калі б ён дажыў да нас. Але, чамусьці, слухаючы артыстаў з Гомельшчыны, мы ўспаміналі, што такія вось энтузіясты-вандроўнікі, які б ні быў у іх талент і прафесіянальны ўзровень, робяць вельмі важную справу. Зразумела, і канкурэнцыя ў гамяльчан — сур'ёзная: людзі цяпер глядзяць па тэлевізары унь якіх артыстаў! А яны — не на экране, яны «жывымі» прыязджаюць у вёску, і спяваюць, і граюць жывым, і ўсталёўваецца непасрэдны кантакт. А мы працягваем лінію такога мастацтва ад Ігната Буйніцкага, ад вытокаў, мы просім і іх, гамяльчан, не забывацца на вытокі...

Чытальнік Аляксандр Шчэрбань.

— Неяк мы прыехалі ў невялікі раённы гарадок, — з усмешкай расказвае нам мастацкі кіраўнік філармоніі Яўгенія Афанасьеўна Іконнікава. — А з залы крычаць: «Нам гітары давайце!» Ну, а потым, калі канцэрт закончыўся, дзякавалі музыкантам.

Артысты ад нас размясціліся так блізка, што відаць кожная жылка на шыі, кожны рух мускула на твары. Юлія Казлова спявае жартоўную песню кампазітара Уладзіміра Кузняцова «Ходзіць Ваня на бліны». Толькі што спявачка сядзела напружаная, сур'ёзная, засяроджаная, а тут уся засвяцілася, здавалася, забыла аб усім, і спявае, спявае з захапленнем...

Мы дагаварыліся не апладзіраваць — нас мала і ўсё можна выказаць словамі, — але ж не — запляскалі, не сталі парушаць старой, як свет, традыцыі.

— З песняй лёгка, з песняй хораша, але з песняй цяжка, — сказала Яўгенія Афанасьеўна. — Добрых, сапраўдных песень мала...

Я ўспомніла нядаўні артыкул Льва Ашаніна ў «Литературной газете». Там ён называе паўтара-два дзесяткі цікавых песень. Калі яшчэ дадаць дзесятак нашых, беларускіх, то хоць і атрымаецца ўнушальны спіс, усё роўна гэтага вельмі мала.

Эквілібр Кім Іконнікаў.

— Дарэчы кажучы, — працягвала Яўгенія Афанасьеўна, — «мучыць» нас яшчэ адно пытанне. Вельмі цяжка набыць ноты твораў беларускіх кампазітараў. Няма клавіраў. А гаворка ж ідзе аб прапагандзе вялікай музыкі.

Юлію Казлову змяніў спявак Іван Шарэкін — гордасць і надзея Гомельскай філармоніі. Працуе два гады, Паспяхова. Дабіўся ўжо нямала. Стаў лаўрэатам абласнога конкурсу вакалістаў, палюбіўся моладзі і не толькі моладзі. Зараз рыхтуецца да рэспубліканскага конкурсу, спадзяецца пасля прыняць удзел ва Ўсесаюзным конкурсе выканаўцаў. Мы аднадушна пажадалі спеваку добрай дарогі. Мы плюнулі тры разы цераз левае плячо, хоць добра ведаем, што поспех залежыць не ад гэтага. Але ўсё ж такі... Мы будзем за яго «хварэць» на гэтым конкурсе і спадзяёмся, што да нас далучацца многія, хто пачуе яго прыгожы голас, убачыць прыемную, без позы манеру трымацца, адчуе глыбокае і радаснае пранікненне ў песню.

На сустрэчы выступілі артыст размоўнага жанру Аляксандр Шчэрбань і эквілібр Кім Іконнікаў.

Не без цікавасці слухалі мы расказ Яўгеніі Афанасьеўны пра работу музычнага лектория. «Чайкоўскі — дзецям», «Па старонках любімых опер», «Ад «Міхася Падгорнага» да сучаснай беларускай оперы», «Апасіяната» — гэта назвы некалькіх лекцый-канцэртаў, з якімі артысты Гомельскай філармоніі раз'язджаюць па вобласці. Асаблівую ўвагу аддаюць гамяльчане прапагандзе музыкі сярод дзяцей.

Кампазітар Юрый Семяняка.

Госцем нашай рэдакцыі быў у гэты дзень і кампазітар Юрый Семяняка, які таксама прысутнічаў на сустрэчы.

— Некалькі дзён назад, калі я рыхтаваўся да зусім іншай сустрэчы, я заглянуў у музычны слоўнік. Мяне зацікавіла слова «філармонія». Зараз я вам зачытаю: «Філармонія (ад грэчаскага друг, гармонія). У СССР дзяржаўная канцэртная арганізацыя, якая мае асноўнай задачай прапаганду высокамастацкіх музычных твораў і выканаўчага майстэрства. Побач з музыкай Ф. прапагандуе таксама іншы раз розныя віды эстраднага мастацтва (балет, мастацкае чытанне і да т. п.)». І сёння мне прыемна адзначыць, што Гомельская філармонія ўзяла правільны курс. Яна імкнецца вырашыць адну з галоўных задач канцэртнай арганізацыі — прапаганду музыкі...

А потым мы задавалі пытанні. Натуральна, што нас многае цікавіла. І колькі канцэртаў дае ў год філармонія, і колькі ў іх канцэртных брыгад, і пра беларускае слова, якое гучыць з эстрады. Але якой цікавай ні была б сустрэча — усё роўна яна канчаецца.

Скончылася і наша. А яны паехалі — з песнямі, з планамі-марамі, з турботамі. Іх чакаюць. Яны патрэбныя.

І. ПІСЬМЕННАЯ.

Аркестр народных інструментаў.

Да 275-годдзя з дня нараджэння ВАЛЬТЭРА

ПРАЗ ВЯКІ...

У 1694 годзе ў Парыжы нарадзіўся Француа Мары Аруэ, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Вальтэра. Вальтэр — буйнейшы прадстаўнік французскай Асветы, пісьменнік, драматург, грамадскі дзеяч.

У вялікім і яркім жыцці Вальтэра ёсць адна асаблівая старонка, у якой, як у кроплі вады, адлюстравалася вялікая духоўная сутнасць гэтага чалавека. Называецца гэта старонка «Справа Каласа».

...9 сакавіка 1762 года. У гэты дзень у Францыі ў Тулузе па прыгавору суда быў пакараны смерцю 68-гадовы Жан Калас. Праз два з лішнім тыдні вестка аб гэтай падзеі дакацілася да маёнтка Фернэ на граніцы Францыі і Швейцарыі, дзе з 1758 года жыў Вальтэр. Вальтэр, азнаёміўшыся з матэрыяламі справы, устанавіў, што пакараны — невінаваты чалавек. «Дарагія браты, — пісаў ён, — можна лічыць даказаным, што тулузскія суддзі калесавалі самага невінаватага з людзей... Крычыце, і няхай крычаць іншыя!»

Вальтэр даказаў, што справа пратэстанта Каласа, абвінавачанага ў забойстве свайго сына нібыта за тое, што той хацеў перайсці ў каталіцтва, інспіравана каталіцкай царквой. Усё сваё жыццё Вальтэр з неверагоднай энергіяй вёў барацьбу з рэлігіяй. У гэтай барацьбе ён высунуў славуты лозунг «Раздушыце гадзіну!» («гадзінай» Вальтэр называў каталіцкую царкву). Гэтым лозунгам Вальтэр заканчваў свае шматлікія пісьмы, лістоўкі, памфлеты, у якіх выкрываліся і высмейваліся царкоўныя дагматы. Вось чаму Вальтэр не мог прайсці міма справы Каласа. «З таго часу, як я пра яе даведаўся, — гаварыў ён, — гэта справа займае мае думкі. Яна не дае мне працаваць...»

Выкрыць крывавыя злачынствы каталіцызму стала справай гонару для Вальтэра. Так, Калас пакараны. Але Вальтэр даказа яго невінаватасць. І гэта будзе яшчэ адным ганебным пакаяннем «гадзіны» — каталіцкай царквы! Вальтэр праводзіць у Англіі падпіску ў карысць сям'і Каласаў, ён адпраўляе пісьмы ва ўсе канцы Еўропы, ён апеліруе да міжнароднай грамадскай думкі. Ён піша вялікі «Трактат аб цярпімасці», у якім, выкарыстоўваючы матэрыялы справы Каласа, выкрывае чалавеканенавісніцкі характар рэлігійнага фанатызму. І Вальтэр дабіўся свайго.

«Ён здолеў вярнуцца да работы, — пісаў вядомы рускі журналіст Улас Дарашэвіч, — толькі тады, калі пасля гераічнай барацьбы невуцтва і нецярпімасць былі знясlaўлены вялікім ганьбаваннем, якое існуе для невуцтва і нецярпімасці, — былі раскрыты, а няшчасныя пакараны смерцю Калас з фанатыка... ператвараўся ў тое, чым ён быў у сапраўднасці, — у ахвяру фанатызму».

«Справа Каласа» было адным з публічных выступленняў Вальтэра, якое ўсхвалявала грамадскасць. Імя Вальтэра, буйнага мысліцеля, аўтара «Філасофскіх навін» і шматлікіх вострых публіцыстычных трактатаў, у абсалютысцкай Еўропе XVIII стагоддзя заззяла яркім полымем вальнадумства. І факел гэты разгарэўся яшчэ ярчэй, калі Вальтэр, стаміўшыся ад ліслівасці і дагаджэнняў «адукаваных» манархаў, знявераўшыся ў магчымасцях «асвечанага» абсалютызму, адасобіўся ў сваім маёнтку Фернэ і адтуль павёў практычную барацьбу з галоўным аплотам абсалютызму — царквой.

Барацьба з царкоўным фанатызмам, ханжаствам — праз гэта прайшлі лепшыя сыны чалавецтва. Зерне, кінутае Вальтэрам, узышло і на рускай глебе...

У 1894 годзе, праз 132 гады пасля справы Каласа, за тысячы вёрст ад Тулузы — у Расіі ў сяле Стары Мултан было ўзбуджана следства па справе адзінаццаці сялян-вацякоў (удмуртаў), якія абвінавачваліся ў забойстве з мэтай рытуальнага ахвярапрынашэння язычаскім багам.

Царскія судовыя ўлады разам з праваслаўнай царквой цкавалі нацыянальныя меншасці, якія жылі ў Расіі, і Мултанская справа была адным з адкрытых праяўленняў гэтага цкавання. Абвінавачванне адзінаццаці сялян-вацякоў у рытуальным забойстве, па сутнасці, ўзводзіла крывавы паклёп на ўвесь народ. І падобна на тое, як Вальтэр узяўся даказаць невінаватасць Каласа і прошукі рэлігійнага фанатызму, у абарону вацякоў выступіў пісьменнік Уладзімір Галаціёнавіч Караленка. Караленка прыняў непасрэдны ўдзел у абароне падсудных пры разбіранні справы ў Казані, апублікаваў рад гнеўных артыкулаў, у якіх пераканаўча даказаў ілжывасць і рэлігійна-шавіністычную падкладку абвінавачвання. У фельетоне «Усмешка Вальтэра» Улас Дарашэвіч піша: «Вальтэр і справа Каласа мне ўспомніліся ўчора, калі я чытаў гутарку з Н. П. Карабчэўскім (вядомы адвакат. — С. Б.) аб Мултанскай справе. ...Караленку не магло адаваць ад справы паведамленне аб цяжкай хваробе яго горача любімай малой дачкі... Ён забыў таксама горача любімую літаратуру і на працягу года не мог напісаць ні аднаго радка...».

І гэтак сама, як Вальтэр, Караленка дабіўся апраўдання несправядліва абвінавачаных людзей. Рэлігійны туман рассеяўся. Па ўспамінах В. Д. Бонч-Бруевіча Уладзімір Ільіч Ленін, заўважыў аднойчы, «што насмешкі і здзекі Вальтэра з каталіцызма у вышэйшай ступені карысныя для дэзінфекцыі чалавечага розуму ад міязмаў рэлігійнага туману і ўяўлення недасягальнасці і недатыкальнасці ўсёй той боскай бяглуздзіцы, якую столькі сотняў гадоў укаранялі ў свядомасць усіх класаў насельніцтва спрытныя прайдзісветы ўсіх рэлігій усіх народаў». Удзел Караленкі ў Мултанскай справе таксама прынёс немалую карысць барацьбе з дзікімі забабонамі і фанатызмам. Гэта і дало прычыну Уласу Дарашэвічу паставіць побач імёны Вальтэра і Караленкі:

«Я, канечне, не хачу назваць В. Г. Караленку Вальтэрам, другім Вальтэрам або нашым Вальтэрам. Я не параўноўваю іх. Я параўноўваю толькі іх любоў да ісціны і справядлівасці».

Я закрыў стары томік Дарашэвіча, выдадзены І. Д. Сыціным, і падумаў, што зараз, калі адзначаецца 275-годдзе з дня нараджэння вялікага француза, гэтыя словы рускага журналіста як нельга больш дарэчы падкрэсліваюць пралёгшую праз вякі, нябачную, але цвёрдую агульнасць прагрэсіўных людзей, імя якой — ваяўнічы гуманізм, чалавечнасць.

С. БУКЧЫН.

УМОВЫ НАВАГОДНЯГА ВЫПУСКУ ГРАШОВА-РЭЧАВАЙ ЛАТАРЭІ БЕЛАРУСКАЙ ССР 1969 ГОДА

1. Агульная сума навагодняга выпуску грашова-рэчавай латарэі вызначана ў 750 тысяч рублёў. На гэтую суму выпускаюцца латарэйныя білеты вартасцю ў 50 капеек.

2. Агульная сума выйгрышаў па навагодняму выпуску грашова-рэчавай латарэі складае 525 тысяч рублёў, або 70 працэнтаў ад сумы выпушчаных білетаў.

3. Латарэйныя білеты дзеляцца на два разрады. Разрад складаецца з 3000 серый з № 35501 па № 38500. У кожнай серыі ёсць 250 білетаў з № 001 па № 250.

Тыраж выйгрышаў па навагодняму выпуску грашова-рэчавай латарэі адбудзецца 22 снежня 1969 года ў г. Мінску.

У тыражы разыгрываецца 304.500 выйгрышаў на суму 525 тысяч рублёў, у тым ліку 6.580 рэчавых выйгрышаў на суму 169.490 рублёў і 297.920 грашовых выйгрышаў на суму 355.510 рублёў.

А. РЭЧАВЫЯ ВЫЙГРЫШЫ

№№ п.п.	Назва выйгрышаў	Кошт аднаго прадмета (у руб. і коп.)	На 1 разрад (375 тыс. руб.)		На 2 разрады (750 тыс. руб.)	
			колькасць выйгрышаў	агульны кошт (у руб. і коп.)	колькасць выйгрышаў	агульны кошт (у руб. і коп.)
1.	Аўтамашына «Масквіч-412»	4.841-25	2	9.682-50	4	19.365
2.	Аўтамашына «Запарожац-966»	3.500	3	10.500	6	21.000
3.	Матацыкл К-650	1.400	2	2.800	4	5.600
4.	Матацыкл М-105	350	4	1.400	8	2.800
5.	Веласіпед мужчынскі дарожны	50	9	450	18	900
6.	Веласіпед жаночы дарожны	56-50	12	678	24	1.356
7.	Халадзільнік ЗІЛ «Масква»	310	5	1.550	10	3.100
8.	Халадзільнік «Днепр-2»	250	10	2.500	20	5.000
9.	Халадзільнік «Мінск-3»	220	20	4.400	40	8.800
10.	Халадзільнік «Саратаў-2»	150	10	1.500	20	3.000
11.	Тэлевізар «Зорка-2»	354	5	1.770	10	3.540
12.	Тэлевізар «Гарызонт»	426	3	1.278	6	2.556
13.	Тэлевізар «Рэкорд»	210	9	1.890	18	3.780
14.	Радыёпрыёмнік «Спідола-ВЭФ-12»	93-02	20	1.860-40	40	3.720-80
15.	Радыёла «Рэкорд-66»	72	10	720	20	1.440
16.	Радыёпрыёмнік «Эцюд»	37-98	20	759-60	40	1.519-20
17.	Радыёла «Сірыус-5»	73-60	10	736	20	1.472
18.	Магнітафон «Днепр-14А»	170	5	850	10	1.700
19.	Фотаапарат «Эцюд»	12-90	250	3.225	500	6.450
20.	Фотаапарат «Чайка-2»	23	9	207	18	414
21.	Фотаэкспанометр «Ленінград-2»	12-90	250	3.225	500	6.450
22.	Пральная машына «Вална-59»	125	17	2.125	34	4.250
23.	Пральная машына «Тула-6»	100	19	1.900	38	3.800
24.	Пылесос «Буран»	42	15	630	30	1.260
25.	Дыван (віцебскі) артыкул 1235	180	10	1.800	20	3.600
26.	Дыван (віцебскі) артыкул 4233	59-20	25	1.480	50	2.960
27.	Дарожка дывановая размерам 3 метры	30	18	540	36	1.080
28.	Гадзіннік мужчынскі ў залатым корпусе	160	7	1.120	14	2.240
29.	Гадзіннік настольны	35	10	350	20	700
30.	Гадзіннік жаночы ў залатым корпусе	83	7	581	14	1.162
31.	Плашч мужчынскі (балоння), размеры 44—46	50	29	1.450	58	2.900
32.	Плашч мужчынскі (балоння), размеры 48—50	55	30	1.650	60	3.300
33.	Плашч мужчынскі (балоння), размер 52—56	60	30	1.800	60	3.600
34.	Плашч жаночы (балоння), размер 44—46	45	32	1.440	64	2.880
35.	Плашч жаночы (балоння), размер 48—50	50	30	1.500	60	3.000
36.	Плашч жаночы (балоння), размер 52—56	55	30	1.650	60	3.300
37.	Электрабрытва «Харкаў»	22-50	11	247-50	22	495
38.	Шапка андатравая, размер 54—57	24	35	840	70	1.680
39.	Кантэйнер для захоўвання хлеба	5	250	1.250	500	2.500
40.	Электрапрас з тэрмарэгулятарам	5	250	1.250	500	2.500
41.	Абрус ільняны і 6 сурвэтак	10-90	250	2.725	500	5.450
42.	Турысцкая палатка 2-месная	70	10	700	20	1.400
43.	Лодка гумавая	80	7	560	14	1.120
44.	Пальчаткі скураныя мужчынскія	4-05	500	2.025	1.000	4.050
45.	Пальчаткі скураныя жаночыя	4-50	500	2.250	1.000	4.500
46.	Ёлачка сувенірная	1-80	500	900	1.000	1.800
	разам:		3.290	84.745	6.580	169.490

Б. ГРАШОВЫЯ ВЫЙГРЫШЫ

100 рублёў	7	700	14	1.400
50 рублёў	12	600	24	1.200
25 рублёў	11	275	22	550
10 рублёў	1.250	12.500	2.500	25.000
5 рублёў	2.250	11.250	4.500	22.500
3 рублі	3.500	10.500	7.000	21.000
1 рубель	141.930	141.930	283.860	283.860
разам:	148.960	177.755	297.920	355.510
усяго:	152.250	262.500	304.500	525.000

ГОСЦІ МІНСКА

У двух спектаклях Беларускага акадэмічнага тэатра оперы і балета выступіў лаўрэат Міжнародных конкурсаў у Варшаве і Празе вядомы польскі спявак Ежы Арлоўскі. У спектаклі «Кармен» ён выканаў партыю Хазе, «Аіда» — партыю Радамеса.

На здымку — Ежы Арлоўскі ў ролі Радамеса.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 лістапада

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. Гісторыя. 10-ы клас. «БССР у перыяд разгортвання камуністычнага будаўніцтва». 9.45 — «Яго універсітэты». Кінанарыс. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — бібліятэка беларускай паэзіі. Антон Бялевіч. «Выбраныя творы». 17.25 — для юнацтва. «Сэрца і крылы». 18.00 — «Панарама навін». 18.15 — «Вынаходнік». Тэлевізійны клуб (М). 18.45 — «У. І. Ленін. Хроніка жыцця і дзейнасці». У сібірскай ссылцы. «Сцяг партыі». Дакументальны фільм (М). 19.15 — «Простая гісторыя». Мастацкі фільм (М). 20.40 — «Эстафета навін» (М). 21.30 — праграма каляровага тэлебачання. І. Тургенеў «Ноч у гасцініцы Вялікага вепрука». Водэвіль (М). 22.25 — «Пяю цябе, Расія». Музычны альманах (М). 23.25 — баскетбол. Зборная Еўропы — зборная Югаславіі. Перадача з Бялграда. 00.25 — навіны (М).

Другая праграма. 10.00 — навіны (М). 10.15 — для дзяцей «Прыходзь, казка» (М). 10.45 — «Па ленінскіх мясцінах». Перадача з Ленінграда. 17.00 — навіны (М). 17.15 — «Навука — вытворчасці» (М). 17.45 — для школьнікаў. «Тэлезнайка» (М). 19.30 — канцэрт.

22 лістапада

Першая праграма. 8.25 — праграма перадач. 8.30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9.00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9.45 — навіны (М). 10.00 — «Будзьце шчаслівыя» (М) 10.30 — сустрэчы з майстрамі тэатра. Народны артыст СССР С. Я. Лемешаў (М). 11.30 — «Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 11.50 — «Музычная шкатулка» 12.10 — «Вецер вандраванняў». Тэлепадарожжа. 13.00 — тэлевізійны народны універсітэт. Факультэт навукі, тэхнікі «Паходжанне і развіццё зямлі» (М). 13.45 — навіны (М) 13.50 — тэлевізійны народны універсітэт. Факультэт культуры. «Сацыялізм. маральная свабода і адказнасць асобы» (М). 14.30 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. І. Дворкін. «Ільвы жывуць на пустэчы». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 15.30 — «Героі В'етнама». Сустрэча з членамі дэлегацыі Асацыяцыі моладзі за вызваленне Паўднёвага В'етнама. 15.50 — «Новыя творы беларускіх кампазітараў. Перадача-канцэрт. 16.30 — Ленінская эстафета» Перадача восьмая. «З беларускай маркай». 17.00 — навіны (М). 17.15 — праграма каляровага тэлебачання. 1. Для дзяцей. «Кракадзіл Гена». Мультфільм. 2. Л. Талстой. «Пасля балю». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 18.30 — «Сёння — рубеж перадавіцкіх». Заўтра — здабытак кожнага». Перадача, прысвечаная калгасу «Звязда» Навагрудскага раёна. 19.00 — міжнародная сустрэча па хакеі. ЧССР — Канада. Перадача з Прагі. 21.20 — навіны (М). 21.30 — «Уладыкі без масак». Перадача другая (М). 22.00 — «Тайна Вільгельма Сторыцы». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма (ЧССР) (М). 23.50 — навіны (М).

Другая праграма. 11.30 — праграма Хабараўскай студыі тэлебачання (М). 12.50 — «Навіны дня». Кінахроніка (М). 15.30 — у эфіры — «Маладосць». «Эстафета пакаленняў». 18.30 — атлас народаў СССР. Чэчэна-Інгушская АССР (М). 19.00 — экран кароткаметражнага фільма «Ведзьма». 19.30 — канцэрт.

23 лістапада

Першая праграма. 8.25 — праграма перадач. 8.30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэатральная механіка». 9.00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9.15 — навіны (М). 9.30 — «Будзільнік». Перадача з Харкава 10.00 — «Музычны кіёск» (М). 10.30 — «Другое жыццё аўташыны». Выступленне старшага інжынера Бабруйскага завода гумава-тахнічных вырабаў М. С. Пуцікава. 11.00 — для дзяцей «Сем-насам з музыкай». 11.15 — «У свеце вобразаў, слоў і фарбаў». Тэлевізійны альманах. 12.15 — «Футбольны калейдаскоп». Фінальны тур конкурсу «Вялельчык у ролі арбітра». 13.00 — А. Чэхаў. «Вішнёвы сад». Спектакль Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі (М). У перапынку — навіны (М). 15.30 — «Прадстаўляем — знаёмцеся». Эстрадны ансамбль студэнтаў Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў. 16.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Самы заходні гарнізон». Перадача з Калінінграда. 16.30 — да III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў. «Сельская гадзіна» (М). 17.30 — праграма каляровага тэлебачання. 1. «Клуб кінападарожнікаў». 2. «Пясняр Масквы — мастак Ю. Пімена». 3. «Мелодыі дружбы» Канцэрт артыстаў польскай эстрады (М). 20.00 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 20.45 — мастацкі фільм (М). 22.20 — у эфіры — «Маладосць» «Алё, мы шукаем таленты». (М). 23.20 — «Спартыўны тыдзень» (М). 23.35 — навіны (М).

ВЫПРАЎЛЕННЕ ПАМЫЛКІ

У нумары нашай газеты за 14 лістапада на старонцы «Часопісы ў лістападзе» дапушчана памылка: вершы «Лесу» і «Зязюля» належаць не А. Сербантовічу, як надрукавана, а К. Камейшу.

Куток калекцыянера

52-гі КАСТРЫЧНІК

52-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Міністэрства сувязі СССР адзначыла выпускам святочнай паштовай мініяцюры.

Малюнак маркі ўяўляе сабой дэкаратыўную кампазицыю, у аснове якой ляжыць адлюстраванне серпа, молата і зоркі — элементаў Дзяржаўнага флага СССР. Урачыстасць і значнасць марцы надаюць адлюстраванне вежаў і зорак Крамля на фоне святочнага салюта, каляровае спалучэнне чырвонага, сіняга і залацістага колераў. На верхняй частцы мініяцюры словы У. І. Леніна «Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла новую эпоху сусветнай гісторыі».

Аўтар маркі — мастак Юрый Левіноўскі.

Мініяцюра выканана спосабам высокага друку на мелаванай паперы. Намінал — 4 капейкі. Памер па перфарацыі — 37 на 37 міліметраў. Зубцоўка грабеньчатая.

Нумар па каталогу — 3848.

ЦІ ВЫПІСАНА Ў ВАС НА НАСТУПНЫ ГОД ГАЗЕТА
«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ПАЎСЮДНА

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04 аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63856 АТ 18430